Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 27 (6003) | 3 лютага 1938 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

Гос. Пуб. Б-ка Ув.С.С.Р.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ:
Партыйную прапаганду — на ўзровень задач партыі!
Выступленне тав. М. М. Літвінава ў камітэце 28-мі.
Сустрэчы дэпутатаў Вярхоўнага Совета з выбаршчыкамі.
За сталінскія 7 — 8 мільярдаў пудоў зярна ў год, за высокія ўраджаі ўсіх культур. Да ўсіх калгаснікаў і калгасніц, рабочых соўгасаў, трактарыстаў, камбайнераў, аграномаў, работнікаў МТС і зямельных органаў.
Аб падрыхтоўцы да XX гадавіны РСЧА і Ваенна-Марскога Флота. Пастанова ЦК ВЛКСМ, ЦС Асоавіяхіма СССР і РСФСР.
Новыя мерапрыемствы па зняццю групы Папаніна з дрэйфуючай крыгі.
З 5 лютага па 5 сакавіка — стаханаўскі месячнік лесазагатовак і вывазак.
АРТЫКУЛЫ:
С. М. Бяляеў. — Рашэнне Пленума ЦК ВКП(б) — дакумент сталінскай мудрасці.
Е. Герасімаў, М. Эрліх. — Героі грамадзянскай вайны. **Нікалай Шчорс.**
С. Брайнін. — Фарсаваць выпуск запасных частак.
С. Краўцоў. — Васілій Тумар.
А. К. — Малодшы камандзір Каротыч.
В. Міронаў. — Да канца ліквідаваць інфекцыйную анемію.
Спаборніцтва пагранічнікаў.
На лесазагатоўках.
ЗА РУБЯЖОМ:
На франтах у Іспаніі. — Ваенныя дзеянні ў Кітаі. — Італьянскія піраты свавольнічаюць на Міжземным моры. — Мітынг пратэсту супроць звярстваў фашысцкай авіяцыі.—Японія рыхтуецца да доўгай вайны.—У Совеце Лігі нацый. Рэзалюцыя па кітайскаму пытанню.

ПАРТЫЙНУЮ ПРАПАГАНДУ — НА ЎЗРОВЕНЬ ЗАДАЧ ПАРТЫІ!

Чарговы Пленум ЦК КП(б)Б абмеркаваў пытанне аб становішчы партыйнай прапаганды. Пленум падверг рэзкай крытыцы буйныя недахопы ў разгортванні партыйнай вучобы і намеціў рад практычных мерапрыемстваў па палепшанню гэтай работы.

Пытанні партыйнай прапаганды, ідэйнае ўзбраенне комуністаў, аўладанне ведамі большэвізма, выхаванне нашых кадраў у духу марксізма-ленінізма, — усё гэта заўсёды было і ёсць адказнейшай задачай партыйных арганізацый. На лютаўска-сакавіцкім Пленуме ЦК ВКП(б) таварыш Сталін з асаблівай сілай падкрэсліў значэнне падняцця палітычнага выхавання комуністаў:

«Я думаю,—таварыў таварыш Сталін,— што калі-б мы змаглі, калі-б мы здолелі нашы партыйныя кадры, знізу дазерху, падрыхтаваць ідэалагічна і загартаваць іх палітычна такім чынам, каб яны маглі свабодна арыентавацца ва ўнутранай і міжнароднай абстаноўцы, калі-б мы здолелі зрабіць іх зусім зрэлымі ленінцамі, марксістамі, здольнымі вырашаць без сур'ёзных памылак пытанні кіраўніцтва краінай, то мы вырашылі-б гэтым дзевяць дзесятых усіх нашых задач».

Нястомныя клопаты арганізатараў большэвіцкай партыі Леніна і Сталіна аб тэарэтычным і палітычным росце нашых кадраў вышыкаюць з асаблівай ролі партыі, як авангарда, як перадавога барацьбіта міжнароднага пролетарыята, як кіраўніка социялістычных перамог у нашай краіне.

Ворагі народа — трацкісцка-бухарынскія, нацыяналістычныя агенты фашызма, пралезшыя ў асобныя партыйныя арганізацыі, зрывалі партыйную вучобу, развальвалі школы і гурткі, засмечвалі прапагандысцкія кадры варожымі людзьмі, затрымлівалі вывучэнне паслякастрычніцкага перыяда нашай партыі.

Большэвіцкая партыя, кіруемая сталінскім ЦК ВКП(б), разграміла гнусныя падкопы ворага. Партыйныя арганізацыі, ліквідуючы астаткі шкодніцтва, абавязаны падняць справу ідэйнага ўзбраення комуністаў на ўзровень сучасных задач.

Пленум ЦК КП(б)Б канстатаваў недаацэнку партыйнай прапаганды ў радзе партыйных арганізацый. Яшчэ існуюць фармальныя адносіны да кіраўніцтва вучобай, прапагандыстамі. Акруткомы, гаркомы, райкомы ад выпадку да выпадку заслухваюць на сваіх пасяджаннях даклады аб рабоце школ, прымаюць агульныя рашэнні і на гэтым супакойваюцца. А, напрыклад, Крупскі райком партыі замест арганізацыі партыйнай вучобы выносіў спагнанні слухачам, прымаў пастановы загаднага зместу.

Для разгортвання партыйнай вучобы і ліквідацыі недахопаў партыйныя арганізацыі абавязаны сістэматычна абмяркоўваць становішча прапаганды на пленумах акругкомаў, гаркомаў і райкомаў. Кіраўнікі партыйных арганізацый павінны самі кіраваць семінарамі партыйнага актыва, прапагандыстаў, агітатараў. Трэба ўвесці ў практыку заслухванне на пасяджаннях бюро райкома і на сходах спрэваздачы прапагандыстаў і слухачоў аб становішчы партыйнай вучобы.

У рашэннях ЦК ВКП(б) аб прапагандысцкай рабоце было ўказана на неабходнасць вывучаць у сетцы партыйнай асветы пытанні бягучай палітыкі. Гэтыя яскравыя ўказанні не выконваюцца. Такім чынам гісторыя партыі ў радзе школ вывучаецца адарвана ад бягучых падзей. Пленум ЦК КП(б)Б прапанаваў аднавіць практыку вывучэння ў школах і гуртках пытанняў міжнароднага і ўнутранага становішча нашай краіны, рашэнняў партыі і ўрада.

У партыйных арганізацыях КП(б)Б ёсць значная колькасць комуністаў-алзіночак, якія жывуць і працуюць на значнай адлегласці ад раённага цэнтра. Партыйныя арганізацыі абавязаны арганізаваць нармальную вучобу комуністаў-адзіночак, склікаючы іх на заняткі не менш трох разоў у месяц. Гэтыя дні павінны быць цвёрдымі днямі вучобы.

Выключна дрэнна пастаўлена вучоба партыйнага актыва. Кіраўнікі гаспадарча-совецкіх арганізацый часта забываюць значэнне рэволюцыйнай тэорыі марксізма-ленінізма. Акруткомы, гаркомы і райкомы партыі павінны стварыць усе ўмовы для нармальнай вучобы партыйнага актыва, арганізаваць семінары, рабіць сістэматычныя даклады, навуковыя лекцыі. Можна толькі вітаць вопыт Гомельскага гаркома, які арганізаваў вучобу партыйнага актыва і зараз накіроўвае групу слухачоў з 50 чалавек на экскурсію ў Маскву, у музей Леніна.

У справе палітычнага выхавання комуністаў і працоўных мас найвялікшую ролю адыгрывае кіно, як сродак наглядной агітацыі. Аднак, партыйныя арганізацыі надзвычай дрэнна скарыстоўваюць кіно. Вопыт Сталінскага РК КП(б)Б (гор. Менск), які да кожнай тэмы па гісторыі партыі ў лекторыі арганізаваў праглядз кінофільмаў гісторыка-партыйнага і рэволюцыйнага зместу, патрабуе пашырэння на ўсю сетку партыйнай асветы.

Пленум ЦК КП(б)Б асаблівую ўвагу звярнуў на становішча комсамольскай вучобы. Неабходна вылучыць для палітшкол ДКСМБ групу кваліфікаваных прапагандыстаў, уключыць найбольш падрыхтаваных комсамольцаў у гурткі партыйнай асветы, вылучыць палітычна граматных таварышаў кіраўнікамі семінараў комсамольскіх прапагандыстаў.

У сістэме партыйнай асветы асаблівае месца займае завочная вучоба. ЦК ВКП(б) у сваім рашэнні ўказваў, што «развіццё завочнага партыйнага радыёнавучання ёсць справа вялікага палітычнага і дзяржаўнага значэння». Гэтага яшчэ не зразумелі асобныя партыйныя арганізацыі. Ёсць факты зрыву вучэбных канферэнцый па віне Сіроцінскага і Мсціслаўскага райкомаў партыі. Нават інструктары па завочнаму навучанню не вылучаны ў радзе раёнаў (Даманавічы і Камарын), а там, дзе яны і ёсць—у пераважнай большасці скарыстоўваюцца, як пастаянныя ўпаўнаважаныя па выкананню гаспадарча-палітычных кампаній.

Такія адносіны да справы завочнай партыйнай вучобы з'яўляюцца зусім непрыпімымі. І таму Пленум ЦК КП(б)Б у сваім рашэнні яшчэ раз падкрэслівае вялікае значэнне радыёпартнавучання і абавязвае партыйныя арганізацыі поўнасцю выконваць вучэбныя планы.

Рашэнні Пленума ЦК КП(б)Б у галіне партыйнай прапаганды абавязваюць партыйныя арганізацыі асаблівую ўвагу звярнуць на ліквідацыю недахопаў у партыйнай вучобе, на арганізацыю нармальных заняткаў ва ўсіх школах і гуртках. Трэба памятаць, што значэнне партыйнай прапаганды яшчэ больш узрастае ў сувязі з рашэннямі студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б). Партыйныя арганізацыі, выпраўляючы дапушчаныя памылкі, умацоўваюць магутнасць і адзінства нашых партыйных радоў, мабілізуюць кожнага комуніста на павышэнне большэвіцкай пільнасці, на рашучую барацьбу з зорагамі народа.

Рэволюцыйная тэорыя Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна ўзбройвае кожнага партыйнага і непартыйнага большэвіка, дае яснае разуменне вялікіх задач, якія стаяць перад нашай краінай, умацоўвае сілы і магутнасць совецкага народа, згуртоўвае працоўных вакол большэвіцкай партыі і геніяльнага правадыра — вялікага Сталіна.

З 5 ЛЮТАГА ПА 5 САКАВІКА — СТАХАНАЎСКІ МЕСЯЧНІК ЛЕСАЗАГАТОВАК І ВЫВАЗАК

Паводле пастановы ЦК ВКП(б) з 5 лютага па 5 сакавіка ў Беларусі будзе праведзен стаханаўскі месячнік лесазагатовак і вывазак. Перад кіраўнікамі лесазагатоўчых і раённых арганізацый, перад старшынямі сельсоветаў і калгасаў паставлена найадказнейшая задача — на працягу месячніка выканаць і перавыканаць квартальны план загатовак і вывазак лесу.

Вынікі работы лесазагатоўчых арганізацый Беларусі за студзень сведчаць аб недапушчальным адставанні ў выкананні найадказнага дзяржаўнага задання. На 1 лютага квартальны план па рэспубліцы выкананы: па загатоўцы на 31,4 проц. і вывазцы — на 27,1 проц. Між тым, як вядома, студзень і люты з'яўляюцца рашаючымі месяцамі па выкананню ўсяго гадавога плана. На жаль, многія кіраўнікі лесапрамгасаў і раённых арганізацый не скарыстоўваюць спрыяючых зімовых умоў (санную дарогу) па фарсаванню загатовак і вывазкі лесу. Асабліва адстаюць Бабруйскі механпункт (выканаў план на 9,9 проц.), Слуцкі леспрамгас (12 проц.), Крупскі леспрамгас (17 проц.), Глускі (9,7 проц.), Бярэзінскі (19,6 проц.) і іншыя.

Такое адставанне можна вытлумачыць толькі тым, што кіраўнікі гэтых леспрамгасаў, раённых партыйных і совецкіх арганізацый недаацэньваюць палітычнага і народнагаспадарчага значэння загатовак і вывазак лесу, не ўзяліся яшчэ сур'ёзна за ліквідацыю вынікаў школніцтва на гэтым участку, не вядуць належнай масавай палітычнай работы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў, сярод лесарубаў і возчыкаў.

ЦК КП(б) ставіць, як адну з абавязковых умоў поспеху стаханаўскага месячніка — шырокае разгортванне масава-палітычнай работы, уздым стаханаўскага руху, каб пакончыць з адставаннем лясной прамысловасці ад патрэб народнай гаспадаркі.

Справа гонару работнікаў лесазагатоўчых, раённых партыйных і совецкіх арганізацый, рэспубліканскага і раённага друку — забяспечыць большэвіцкае правядзенне стаханаўскага месячніка.

ПАПРАЎКА

Ва ўчарашнім нумары «Звязды» ў перадавым артыкуле «Узначаліць социялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай», па віне супрацоўніка рэдакцыі тав. Шляфера, у 9 радку апошняга абзаца дапушчана скажэнне. Трэба чытаць: «Перадавыя калгасы рэспублікі змагаюцца за 20—25 цэнтнераў хлеба, за 250—300 і больш цэнтнераў бульбы, за 7—10 цэнтнераў ільнавалакна з гектара».

Рэдакцыя просіць выбачэння ў сваіх чытачоў за дапушчанае скажэнне.

ВЫСТУПЛЕННЕ т. М. М. ЛІТВІНАВА Ў КАМІТЭЦЕ 28-мі

ЖЭНЕВА, 1 лютага. (БЕЛТА). Сёння раніцой на пасяджэнні камітэта 28-мі выступіў народны камісар замежных спраў СССР тав. М. М. Літвінаў. Ён сказаў:

«У сувязі з рэформай пакта ад членаў Лігі паступіла мноства прапаноў, якія датычаць амаль усіх артыкулаў пакта. Не дзіўна і не выпадкова тое, што дыскусія пачалася і разгортваецца выключна вакол артыкула 16-га, бо ён з'яўляецца, сапраўды, самым жыццёвым нервам Лігі. Неасцярожна пашкодзіўшы гэты нерв, можна лёгка выклікаць параліч усяго арганізма.

Я з вялікай увагай слухаў і чытаў аргументы тых, хто выступае або за поўнае скасаванне артыкула 16-га, або за яго аслабленне, або за ператварэнне яго ў невідзімку, які то знікаў-бы, то зноў з'яўляўся.

Найбольш паслядоўнымі праціўнікамі артыкула 16-га з'яўляюцца тыя, хто лічыць непатрэбным наогул міжнароднае ўмяшанне для абароны бязапасных членаў Лігі, для папярэджання ці прыпынення агрэсіі, тыя, якія хацелі-б ператварыць Лігу ва універсальны камітэт па неўмяшанню, прадастаўляючы поўную свабоду дзеянняў любому агрэсару, у любым выпадку; яны хацелі-б бачыць у Лізе не-то нейкую дыпламатычную акадэмію, це-то добрачынное таварыства — адным словам арганізацыю, не маючую нічога агульнага з аховай міру, не накладаючую ніякіх абавязацельстваў на сваіх членаў. Будучы членамі арганізацыі, яны заяўляюць, што не хочуць браць такіх абавязацельстваў, якіх не нясуць нечлены гэтай арганізацыі. Адсутнасць абавязацельстваў, натуральна, спірае ўсякую грань паміж членамі і нечленамі таварыства. З імі спрачацца аб статуце таварыства бескарысна, калі яны адмаўляюць самую неабходнасць таварыства.

Таксама бескарысна спрачацца аб сэнсе артыкула 16-га з тымі, хто ўжо прышоў да заключэння, што калектыўная бязапаснасць не існуе, што яна немагчыма, што кожны за сябе, а бог за ўсіх. Для вазнясення малітваў богу Жэнева з'яўляецца не адзіным свяшчэнным месцам.

Мы слухалі тут такіх праціўнікаў артыкула 16-га пакта Лігі, якія заяўляюць: мы наогул супроць артыкула 16-га, але, як-бы ні рашылі пытанні, мы самі падпарадкоўваемся голасу нашых уласных інтарэсаў, рашылі аслабаніцца ад яго, паколькі гэта нас датычыць, бо хочам быць абсалютна нейтральнымі. Такі выпадак заслугоўвае асобага абмеркавання і ў іншым месцы.

Мне толькі няясна — ці маюць яны на ўвазе аднабаковы ці двухбаковы нейтралітэт, інакш гаворачы, ці павінен іх нейтралітэт ахоўваць Лігай ці-ж і Ліга можа аставацца нейтральнай у выпадку парушэння гэтага нейтралітэта.

Далей, пажадана было-б ведаць — ці намераны яны, аслабаніўшыся ад усякага ўдзелу ў нясенні якіх-небудзь абавязкаў, вынікаючых з артыкула 16-га, адмовіцца ад удзелу ў абмеркаванні і галасаванні пытанняў, звязаных з прымяненнем гэтага артыкула.

Мяне, аднак, больш за ўсё цікавіць аргументацыя тых рэфарматараў пакта, якія прынаюць і нам тут сказалі, што мір не можа быць забяспечан толькі абяцаннямі, пактамі ненападу і арбітражам і што без мер прымусу Ліга нацый не можа захаваць сваю ўнутраную сувязь або аказваць уплыў на міжнародную палітыку. Яны пярэчаць супроць артыкула 16-га не прынцыпова, а толькі таму, што ён у адных выпадках недастаткова функцыянаваў, а ў другіх — зусім не функцыянаваў. Тут ужо справядліва ўказвалася на тое, што выпадак парушэння закона не даказвае яшчэ неабходнасці адмены закона.

Я хацеў-бы ў дадатак напомніць, што калі санкцыі, на жаль, у адных выпадках зусім не прымяняліся, а ў другіх выпадках прымяняліся няпоўнасцю або, на жаль, спыняліся, то гэта рабілася са згоды большасці членаў Лігі, прычым заўсёды са спасыланнем на тыя самыя «рэальнасці», у імя якіх ад нас цяпер патрабуюць поўнай адмены абавязковасці артыкула 16-га.

Было-б больш лагічна, мне здаецца, весці барацьбу супроць пастаянных спасылання на рэальнасці і на асаблівыя лакальнасці, настайваючы на пуску ў ход механізма артыкула 16-та ва ўсіх выпадках агрэсіі. Спасылание на рэальнасці робіцца таму, што ёсць сумненні ў поспеху санкцый, але інтэгральнае выкананне артыкула 16-га, калі не ўсімі, то велізарнай большасцю членаў Лігі не можа не забяспечыць гэты поспех. Няма такіх дзяржаў або такога блоку дзяржаў, якія магчі-б процістаяць аб'яднаным сілам членаў Лігі нават у яе цяперашнім складзе.

Не трэба забываць, што артыкул 16-ты мае не толькі мэтаю прыпыніць пачатую агрэсію, а што ён мае і другую больш важную задачу — служыць перасцярогай агрэсару, утрымліваць яго ад агрэсіі. Непрымяненне артыкула 16-га ў некаторых выпадках, вядома, аслабіла Лігу ў гэтых адносінах, але ўсё-ж, пакуль яна захоўвае свой цяперашні характар або аўтаматычнасць, з ёю не могуць не лічыцца і фактычна лічыцца агрэсіўныя краіны. Толькі гэтым і тлумачыцца ўпартая барацьба, якую як агрэсіўныя краіны, так і іх сакрэтныя саюзнікі вядуць супроць Лігі наогул і ў асаблівасці супроць артыкула 16-та. Стала быць гэты артыкул мае каштоўнасць і выкідваць яго не рацыянальна. Акцыянернае таварыства, маючы маемасць, якая цяжка рэалізуецца ў які-небудзь поўны момант, не знішчае гэтай маемасці, а прадаўжае лічыць яе ў сваім актыве. Артыкул 16-ты з закладзенымі ў ім магчымасцямі з'яўляецца самым каштоўным актывам Лігі і патэнцыялам міру.

Дапусцім, што, следуючы ўнесеным тут прапановам, мы зрабілі-б артыкул 16-ты факультатыўным, дзейнічаючым толькі ад выпадку да выпадку. Ён адразу-ж страціць свой устрашальны характар для агрэсара, які будзе разлічваць у кожным асобным выпадку на запалохванне найбольш слабых членаў Лігі, каб утрымаць іх ад галасавання за санкцыі. Мы бачылі, як гэтаму запалохванню падвяргаліся некаторыя дзяржавы нават пры аўтаматычнасці артыкула 16-га, не гледзячы на тое, што кожны член Лігі мог указваць агрэсару, што ён прымяняе санкцыі не з-за варожасці да яго, не з-за дрэнных адносін з ім, а выключна ў сілу свайго абавязку, у сілу дагаворнага абавязацельства. Значна горш будзе становішча членаў Лігі, калі яны на тэты абавязак спаслацца не змогуць, калі ў іх будзе свабодны выбар галасавання за прымяненне санкцыі ці супроць, талы запалохваць іх будзе значна лягчэй. Агрэсар будзе дасягнічаць не толькі мерамі запалохвання, але і мерамі задабрывання, і можа атрымацца становішча, калі галасаванне ў Лізе за санкцыі ці супроць іх стане прадметам гандлю паміж агрэсарам і асобнымі краінамі. Дастаткова ўявіць сабе на хвіліну гэту магчымасць, каб зразумець, якой рызыцы разлажэння і разбэшчвання падвергнецца талы Ліга нацый.

Размовы аб адмене ці аслабленні артыкула 16-та нарожаны, вядома, упадкам веры ў калектыўную бязапаснасць і міжнародную салідарнасць і страхам перад разгулам агрэсіі. Гэты разгул агрэсіі, мне здаецца, павінен часткова дзейнічаць і ў другім напрамку. Ён пачынае напамінаць аб патражаючых небяспеках дзяржавам, якія яшчэ некалькі год таму назад маглі-б лічыцца зусім укрытымі і застрахаванымі ад іх. Разгул агрэсіі, які распаўсюдзіўся на ўсе кантыненты, ставіць твар да твару з небяспекай усе дзяржавы — малыя і вялікія. Палітычная і ваенная аўтаркіі, пры ўсім іх жахары павелічэння ўласных узбраенняў, не з'яўляюцца алзінымі і, ва ўсякім выпадку, не самымі надзейнымі сродкамі забеспячэння сваёй бязапаснасці. Калектыўны характар адбываўшайся агрэсіі павінен немінуча штурхаць дзяржавы ў бок калектыўнай бязапаснасці. Калектыўная бязапаснасць — гэта ёсць артыкул 16-ты, і яго мы павінны захаваць і, калі ажажацца магчымым, узмацніць».

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА XX ГАДАВІНЫ РСЧА І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА

Пастанова ЦК ВЛКСМ, ЦС Асоавіяхіма СССР і РСФСР

20-годдзе Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота ёсць свята ўсяго совецкага народа, усіх совецкіх патрыётаў. ВЛКСМ і Асоавіяхім, якія прадстаўляюць магутны рэзерв Чырвонай Арміі, у сувязі з 20-годдзем Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі павінны правесці сур'ёзную палітычную работу ў масах працоўных і асабліва сярод працоўнай моладзі, азнаменаваць слаўную гадавіну канкрэтнымі поспехамі ў сваёй абаронная рабоце і ваенным абучэнні комсамольцаў і членаў Асоавіяхіма.

Цэнтральны Камітэт ВЛКСМ і Цэнтральны Совет Асоавіяхіма прапануюць:

1. Правесці ў першай палове лютага сумесныя сходы первічных арганізацый ВЛКСМ і Асоавіяхіма па пытанню «20-годдзе Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і абаронная работа комсамола і Асоавіяхіма», з дакладамі сакратара камітэта ВЛКСМ і старшыні Совета Асоавіяхіма.

Правесці сумесныя сходы гарадскіх, раённых актываў комсамола і Асоавіяхіма па гэтаму пытанню з дакладамі сакратара гаркома (райкома) ВЛКСМ і старшыні гор(рай)совета Асоавіяхіма.

2. Арганізаваць правядзенне дакладаў, лекцый і гутарак на сходах працоўных, сходах моладзі, фізкультурнікаў, у клубах, чырвоных кутках, хатах-чытальнях, у аэраклубах і іншых вучэбных арганізацыях Асоавіяхіма — аб Чырвонай Арміі і асобных этапах гісторыі грамадзянскай вайны.

Рэкамендаваць наступныя прыкладныя тэмы дакладаў:

Таварыш Сталін аб трох асаблівасцях Чырвонай Арміі;

ВКП(б) — арганізатар і правадыр Чырвонай Арміі;

Асноўныя этапы будаўніцтва Чырвонай Арміі;

Разгром германскіх інтэрвентаў на Украіне;

Разгром першага паходу «Антанты»;

Разгром другога паходу «Антанты»;

Разгром трэцяга паходу «Антанты».

Вызваленне Далёкаўсходняга края ад японскіх імперыялісцкіх захватчыкаў.

Паказаць у гэтых дакладах і лекцыях ролю комуністычнай партыі і яе правадыроў Леніна і Сталіна ў стварэнні Чырвонай Арміі і арганізацыі яе перамог над белагвардзейцамі і інтэрвентамі, расказаць пра таварыша Сталіна як непасрэднага кіраўніка рашаючых баявых аперацый і тварца важнейшых стратэгічных планаў Чырвонай Арміі ў грамадзянскай вайне.

Для дакладаў і лекцый прыцягнуць камандзіраў і палітработнікаў РСЧА, удзельнікаў грамадзянскай вайны, лепшых комсамольскіх прапагандыстаў.

3. Арганізаваць вечары сустрэчы комсамольцаў, асоавіяхімаўцаў, моладзі з чырвонаармейцамі, камандзірамі і палітработнікамі Чырвонай Арміі, з падшэфнымі часцямі Ваенна-Морскага і Ваенна-Паветранага флота, Героямі Совецкага Саюза, ордэнаносцамі Чырвонай Арміі, баявымі камандзірамі, ветэранамі грамадзянскай вайны.

Расказаць моладзі на гэтых вечарах аб гістарычным шляху Чырвонай Арміі, яе баявых эпізодах, гераізме яе байцоў і камандзіраў, аб легендарных героях грамадзянскай вайны, маршалах Чырвонай Арміі і жалезным палкаводцу таварышу Варашылаву.

Арганізаваць ваенныя паходы, экскурсіі, лыжныя вылазкі па маршрутах і да помнікаў грамадзянскай вайны.

4. Арганізаваць спецыяльныя заняткі комсамольцаў, асоавіяхімаўцаў, моладзі па разбору асобных ваенных аперацый і эпізодах грамадзянскай вайны, вывучаючы пры гэтым неабходныя карты і схемы, размяшчэнне сіл, планы камандавання, паслядоўнасць аперацый.

Рэкамендаваць прыкладныя тэмы для гэтых заняткаў:

Гераічная абарона Царыцына;

Сталінскі план разгрому Дзенікіна і яго ажыццяўленне;

Абарона Піцера і разгром Юдзеніча;

Сталін і Дзержынскі пад Перм'ю;

Аперацыі Першай Конная арміі;

Вызваленне Кіева ад белапалякаў;

Узяцце Перакопа.

5. У комсамольскіх палітычных школах і гуртках і вучэбных арганізацыях Асоавіяхіма (аэраклубы, школы, вучэбныя пункты, стралковыя клубы і марскія школы) правесці двое заняткаў на тэмы:

1) Сталін і Чырвоная Армія (па кнізе таварыша Варашылава);

2) 20 год Чырвонай Арміі.

6. У палітычнай рабоце вакол XX гадавіны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі неабходна скарыстаць комсамольскіх прапагандыстаў, актыў комсамола і Асоавіяхіма, усіх лепшых агітатараў—комсамольцаў і асоавіяхімаўцаў, якія актыўна працавалі ў часе выбарчай кампаніі.

Гаркомам, райкомам комсамола і аднаведным советам Асоавіяхіма правесці інструктаж прапагандыстаў і агітатараў-чытчыкаў, забяспечыць іх літаратурай, правільна расставіць іх сілы з тым, каб ахапіць агітацыйнай работай усіх працоўных, апіраючыся пры гэтым на вопыт выбарчай кампаніі. У агітацыйнай рабоце шырока скарыстаць паказ кінофільмаў, мастацкую самадзейнасць, вечары і канцэрты, прысвечаныя Чырвонай Арміі.

7. ЦК ВЛКСМ і Цэнтральны Совет Асоавіяхіма прапануюць усім комсамольскім і асоавіяхімаўскім арганізацыям у найкароткія тэрміны закончыць работу па ўкамплектаванню вучэбных арганізацый—аэраклубаў, марскіх школ, школ і вучэбных пунктаў ППХА, стралковых каманд, груп самаабароны ППХА ў жыллёвых дамах і школах і т. д. з тым, каб да гадавіны РСЧА і Флота ўся вучэбная сетка Асоавіяхіма была поўнасцю скамплектавана і прыступіла да нармальнай вучэбнай работы.

8. На сходах комсамольскіх і асоавіяхімаўскіх арганізацый адзначыць лепшых комсамольцаў і асоавіяхімаўцаў, якія набылі поўную ваенную кваліфікацыю,—пілотаў, стралкоў, танкістаў, парашутыстаў, кавалерыстаў, інструктараў ППХА, радыстаў і т. д.

Гаркомам (райкомам) ВЛКСМ і горсоветам (райсоветам) Асоавіяхіма арганізаваць сустрэчы асоавіяхімаўскіх вучлётаў і пілотаў, лепшых стралкоў, вучняў марскіх школ, парашутыстаў і т. п. з байцамі аднаведных відаў зброі РСЧА з тым, каб комсамольцы і асоавіяхімаўцы, якія атрымалі ці набываюць у Асоавіяхіме ваенную кваліфікацыю, азнаёміліся з вопытам, падрыхтоўкай, практыкай трэніроўкі байцоў РСЧА і ў сваёй далейшай рабоце над дасягненнем і павышэннем ваеннай кваліфікацыі раўняліся на ўзровень падрыхтаванасці байцоў Чырвонай Арміі.

9. Арганізаваць да 20-годдзя РСЧА стралковыя спаборніцтвы, паказальныя снайперскія стрэльбы, арганізаваць масавую здачу абаронных норм, правесці абаронныя святы з паказам працоўным работы асоавіяхімаўскіх кавалерыстаў, стралкоў, груп самаабароны.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ВЛКСМ.
ЦЭНТРАЛЬНЫ СОВЕТ АСОАВІЯХІМА.

15-ГОДДЗЕ ЖУРНАЛА „РАБОТНІЦА“

У лютым спаўняецца 15-годдзе журнала «Работница»—аднаго з любімых журналаў совецкай жанчыны. Лік яго падпісчыц узрос з 10 тысяч у студзені 1923 года да 350 тысяч у студзені 1938 года.

За ўдарную работу па комуністычнаму выхаванню жаночых мас урад узнагародзіў у 1933 годзе «Работницу» ордэнам Прапоўнага Чырвонага Сцяга.

Журнал за апошнія 5 год змагаўся за выкананне ўказанняў таварыша Сталіна, даных ім у дзень 10-гадовага юбілею журнала.

Таварыш Сталін у сваім прывітанні пісаў:

«Горача вітаю «Работницу» ў дзень 10-годдзя яе існавання. Жадаю ёй поспехаў у справе выхавання жаночых пролетарскіх мас у духу барацьбы за поўнае таржаство социялізма, у духу выканання вялікіх заветаў нашага настаўніка — Леніна».

Прывітанне таварыша Сталіна яшчэ больш натхніла жаночыя масы краіны Советаў на барацьбу за выкананне другой сталінскай пяцігодкі, за ўмацаванне абароназдольнасці нашай радзімы, за поўнае таржаство социялізма ў нашай краіне.

У сувязі з 15-годдзем журнала, ЦК ВКП(б) прапанаваў адзначыць яго юбілей у цэнтральным друку, дакладамі па радыё, спецыяльнымі сходамі работніц — чытачоў і рабкорак журнала.

Улічваючы велізарны попыт на журнал «Работница» з боку работніц і жонак рабочых, ЦК ВКП(б) павялічыў на 1938 год тыраж журнала да 400 тысяч экземпляраў.

Для лепшай арганізацыі палітычнай і масавай работы з чытачамі, рабкоркамі і падпісчыцамі ЦК ВКП(б) дазволіў рэдакцыі «Работницы» мець у найбольш буйных прамысловых цэнтрах сваіх пастаянных карэспандэнтаў.

НОВЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА ЗНЯЦЦЮ ГРУПЫ ПАПАНІНА З ДРЭЙФУЮЧАЙ КРЫГІ

Па поваду зняцця з крыгі мужнай чацвёркі папанінцаў у Галоўнаўночморшляху нам паведамілі аб наступным:

Данае 1 лютага распараджэнне капітану «Мурманец» ісці да станцыі Паўночны полюс. Каардынаты: шырата 72 градусы 41 мінута, даўгата 4 градусы 8 мінут вест».

Становішча на крызе за прайшоўшыя суткі пагоршылася.

Лёдавыя палі прадаўжалі драбіцца. У выключных умовах непасрэднай небяспекі для жыцця адважная чацвёрка не згубіла мужнасці і зрабіла выключны подвіг. Пераходзячы на новую крыгу, папанінцы не толькі змаглі забяспечыць сябе трохмесячным запасам харчоў, але і выратавалі як рэзультат навуковых работ, так і навуковае абсталяванне.

Аб становішчы на крызе ў тэлеграме, адпраўленай у 16 гадзін 2 лютага, тав. Папанін паведамляе:

«У раёне станцыі прадаўжае разломваць абломкі палёў на адлегласці не больш 70 метраў. Трэшчыны 1—5 метраў, разводзе да 50. Крыгі ўзаемна перамяшчаюцца, да гарызонта лёд 9 балаў. У межах бачнасці пасадка самалёта немагчыма. Жывем у шаўковай палатцы на крызе пяцьдзесят на трыццаць метраў. Другую мачту антэны ставім на час сувязі на другую крыгу. З намі трохмесячны запас, апаратура, вынікі. Прывітанне ад усіх ПАПАНІН».

Па даручэнню ўрада, Галоўным упраўленнем Паўночнага Марскога шляху прыняты наступныя меры: капітану «Мурманца» тав. Ульянаву тав. Шмідтам дадзена тэлеграма:

«Урад даручыў мне перадаць Вам заданне абавязкова дайсці да лагера Папаніна, выратаваць герояў — зняць іх з крыгі. Укладзіце ўсе сілы ў выкананне гэтага гістарычнага задання. Даносьце аб прасоўванні кожныя шэсць гадзін. **Шмідт**».

Ледаколу «Таймыр» дадзена распараджэнне выйсці ў мора раніцай 3 лютага. На ледакол дадаткова пагружан гідрасамалёт «Ш-2». Кіраўніком аперацыі на «Таймырэ» назначан т. **Остальцэў А. В.**, у якасці намесніка тав. Шмідта па экспедыцыі.

У аперацыю па выратаванню мужнай чацвёркі ўключаецца ледакол «Ермак». Дадзена распараджэнне забяспечыць скарачэнне рамонту лёдаколу на працягу бліжэйшых двух — трох дзён. Тав. Шмідт выехаў у Ленінград, адкуль на «Ермаку» выходзіць у мора.

Фарсуецца падрыхтоўка двух самалётаў «ПКБ-30» для экспедыцыі тав. Спірына.

Каб арганізаваць базы для гэтай экспедыцыі, дадзена ўказанне прыступіць да тэрміновай пагрузкі ледакольнага парахода «Мурман».

Тав. Папаніну дадзена наступная тэлеграма:

«Паўночны полюс, таварышу Папаніну.

Ваша тэлеграма даложана ўраду. Усе захоплены вашай мужнасцю, большэвіцкай вытрымкай у такі цяжкі для Вас момант. Усе шлюць Вам гарачае прывітанне і ўпэўнены, што ў гераічнай барацьбе са стыхіяй пераможцам будзе Ваш адважны калектыў.

Урад зацвердзіў рад новых мер па аказанню Вам хуткай дапамогі. «Таймыр» выйдзе трэцяга з Остальцэвым. «Мурманцу» даручана абавязкова прабіцца да Вас. Тэрмінова рыхтуецца «Ермак». Я выходжу на «Ермаку». **Шмідт**».

ВАСІЛІЙ ТУМАР

Вярнуўшыся з Чырвонай Арміі пасля дэмабілізацыі, Васілій асеў на зямлю. Гэта была родная, поўная сокамі зямля заваяваная і адстоеная ім у барацьбе разам з тысячамі іншых працоўных ад беларускіх паноў.

Але Васілія цягнула ў горад. Ён даўно марыў аб вытворчасці. І ў 1934 годзе Тумар паступіў на барысаўскі лесазавод імя Молатава. Ён прынёс сюды з вёскі сваю працавітасць, спакойны характар і жаданне добра працаваць. Але гэтага было недастаткова для таго, каб адразу стаць кваліфікаваным рабочым. Завод — соцыялістычнае прадпрыемства — патрабуе многа такога, з чым Васілій раней не быў знаём. Гэта трэба было набыць тут у працэсе работы. А хацелася хутчэй авалодаць працэсамі вытворчасці.

Тумар акуратна наведваў гурток тэхвучобы, ён лавіў кожнае слова выкладчыка, глыбока фіксаваў іх у сваёй памяці, глынаў усё, што датычыць тэхналогіі яго працэса. Васілій хапеў ведаць многа, так многа, каб хапіла не толькі для сябе, але і для перадачы іншым.

Заняткі ў гуртку закончыліся. Тумар атрымаў пры злачы экзамена ацэнку на выдатна. Цяпер асталося такую-ж ацэнку атрымаць на рабоце, прымяняючы атрыманыя веды.

Васілій Барысавіч пачаў выконваць дзве нормы. Ён стаў стаханаўцам. Тумар адчуў у сябе вялікую сілу, ён адчуў, што можа даць вытворчасці значна больш.

Перамогі краіны — гэта перамогі яе людзей. І вось адным з тых, якія множаць перамогі краіны соцыялізма, хацеў стаць Тумар.

Некалькі разоў ён перачытваў прамову таварыша Сталіна на Ўсесаюзнай нарадзе стаханаўцаў. Сталінскія словы, прасякнутыя такой глыбінёй і мудрасцю, здаваліся Тумару вельмі простымі і зразумелымі, быццам Сталін выказаў яго, Тумара, мысліі.

Ён пачаў працаваць яшчэ лепш. Увесь час думаў над рацыяналізацыяй свайго працэса, каб паскорыць работу, павысіць прадукцыйнасць працы. Васілій не прымаў усур'ёз разговоры асобных сталяроў, якія выказвалі такую думку:

— Што ў нашай сталярнай справе можна яшчэ прыдумаць? Склаўшы часткі і атрымаеш шафу, стол або тумбачку.

— Усё гэта вядома так, — разважаў Тумар, — але-ж самую зборку можна хутчэй рабіць. Яго творчая думка ўсё мацней працавала над удасканаленнем працэса. Ім рухала вялікая сіла соцыялістычнай працы, яго акрыляў стаханаўскі рух і лепшыя прыклады перадавікоў стаханаўскага племя.

Працуючы над зборкай шафаў, ён раней поўнасцю заканчваў адну шафу, а потым ужо браўся за другую. І вось Тумар пачаў арганізаваць сваю работу інакш. Ён пачаў адначасова збіраць некалькі шафаў. Уяўўшы, напрыклад, 5—6 ніжніх паліц, Васілій устаўляў іх разам у такой-жа колькасці шафаў. Такім чынам ён паступаў з усімі астатнімі дэталямі. Гэта пазбаўляла ад частай змены рознага інструменту. Такі метад работы дае эканомію часу і значна павялічвае прадукцыйнасць працы. Апрача гэтага Тумар удзяляе шмат увагі арганізацыі свайго рабочага месца.

Прымяняючы свой метад, Васілій Барысавіч дабіўся высокай выпрацоўкі. 26 снежня 1937 года ён сабраў за змену 11 шафаў, выканаўшы сваю норму на 663 проц. 11 студзеня перад адкрыццем першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР Тумар сабраў 13 шафаў, выканаўшы норму на 783 проц. Свой рэкорд ён прысвяціў адкрыццю совецкага парламента.

Так растуць у нашай краіне рабочыя таленты. Так вырас у героя соцыялістычнай працы Васілій Барысавіч Тумар.

С. КРАЎЦОЎ.

г. Барысаў.

Лепшыя стаханаўкі матальнага цэха віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя Клары Цэткін, якія перавыконваюць свой вытворчы план: **М. І. Іванова** — на 130 проц. і **В. Н. Хачкоўская**—на 124 проц. Фото С. Грына.

ФАРСАВАЦЬ ВЫПУСК ЗАПАСНЫХ ЧАСТАК

ВІЦЕБСК. (**Кар. «Звязды»**). На рабочы калектыў станкабудаўнічага завода імя Кірава ўскладзена баявая задача: высокаякасна і ва ўстаноўлены тэрмін выканаць урадавае заданне па выпуску запасных частак для веснавой пасеўнай кампаніі.

Усяго завод павінен выпусціць да трох тысяч трактарных плугоў 80.600 дэталяў.

З вялікім прарывам быў скончан чацверты квартал 1937 года. План выпуску запасных частак быў выканан усяго толькі на 36 проц.

У першым квартале завод павінен вырабіць 35.130 дэталяў, з якіх на студзень прыпадае 11.710 шт. Паводле даных заводакіраўніцтва, на 30 студзеня ўжо было выпушчана 18.103 дэталі. Такім чынам, завод пакрыў прарыў чацвертага квартала і выканаў студзеньскае заданне.

Па ряду дэталяў (ступіцы задніх калёс, стойкі да плугоў і інш.) квартальнае заданне ўжо выканана. Але для дзяржавы, як гэта добра вядома дырэктару завода тав. Слёзбергу, важны не толькі агульны выпуск, але, галоўным чынам і перш за ўсё, выпуск запчастак у патрэбным яго асартыменце. А тут якраз справа абстаіць не зусім добра.

Рад важных аб'ектаў яшчэ не закончан вытворчасцю. Да іх ліку, напрыклад, адносяцца універсальныя адвалы, якіх патрэбна ў першым квартале выпусціць 500 шт., 1 калёсы да плуга «Т-30П» у колькасці 200 шт. Ні адной дэталі з гэтых аб'ектаў у гатовым выглядзе на заводзе няма. Да вырабу задніх калёс да плугоў ТП4/5 (якіх трэба выпусціць 130 штук) прыступілі таксама толькі гэтымі днямі. Між тым поўную колькасць гэтых дэталяў ужо даўно можна было вырабіць, але ўся бяда ў тым, што на заводзе яшчэ не выкаранена школьнае чарганне—спачатку, кажуць, выпусцім адны дэталі, а пасля астатнія. Завод сыравінай забяспечан і мае ўсе магчымасці фарсаваць іх выпуск.

Ніяк нельга апраўдаць адставанне ў выпуску плугоў «СУХЕНІ № 2». Гэтых плугоў у першым квартале патрэбна ідзе 1500, пакуль-жа далі не больш 200 шт.

На заводзе не мала яшчэ ёсць ўнутрыцэхавых непаладкаў, што тармозіць выпуск як запчастак, так і іншай заданнаванай прадукцыі. Так, у кавальскім цэху, з-за незабеспячэння яго інструментальным цэхам добраякаснымі плансонамі, працас шпанкоўкі квадратных дзір у палявых лошках робіцца не на штампе, а ўручную. Гэта больш чым у тры разы зніжае прадукцыйнасць працы. З-за незабеспячэння заводакіраўніцтвам нафтай у гэтым-жа кавальскім цэху не працуе вялікая пэмептацыйная сетка, у выніку чаго затрымліваецца тэрмічная апрацоўка адвалаў і палевых дошак.

Нельга абыйсці таксама маўчаннем і таго, што рабочым загатоўчага цэха не створаны ўмовы для ўдарнай стаханаўскай працы. Рэзанне жалеза і сячэнне дэталяў робіцца ў халодным бараку і проста на двары, што безумоўна адбіваецца на здароўі рабочых (частае захворванне) і на іх прадукцыйнасці.

У сельскагаспадарчым цэху ўсе балтарэзкі няспраўныя і знаходзяцца ў расхатаным стане, што затрымлівае забеспячэнне балтавым матэрыялам участка зборкі плугоў Рамонтны цэх (старшы механік тав. Шафранаўскі) ніяк «не можа» адрамантаваць балтарэзку, даручаную яму два з лішнім месяцы назад. Ніхто на гэта не звярачае аніякай увагі. Няма нікому справы да таго, што балтарэзчыкі тт. Файн, Кушняроў і інш. толькі з-за няспраўнасці балтарэзак выконваюць сваю норму на 65—90 проц.

Добра спраўляецца з выпускам запчастак ліцейны цэх. Гэты цэх сістэматычна выконвае і перавыконвае свае штотэднёвае заданне па фармоўцы і адліўцы неабходных дэталяў.

Ва ўсіх цэхах завода ёсць добрыя таварышы, якія паказваюць на працэсах выпуску запчастак узоры стаханаўскай, ударнай працы. У кавальскім цэху асабліва праявіў сябе штампоўшчык тав. Шаверыкаў і кавалі тт. Салкоўскі і Літоўка. 30 студзеня штампоўшчык Шаверыкаў за 2 гадзіны адштампаваў 780 палевых дошак, замест прадугледжаных па норме на гэты час 560 шт. Каваль Салкоўскі на коўцы лемяхоў выконвае сваю норму на 285 проц., т. Літоўка — на 200 проц.

У сельскагаспадарчым цэху наперадзе ўсіх ідзе стаханавец тав. Багарал. На пяжжім працэсе, абзірны запчастак, ён выконвае сваю норму на 246 проц. Працуючы на гэтым-жа працэсе тав. Семчук выконвае сваю норму на 197 проц. 187 проц. нормы дае свідравальшчык тав. Папоў. Аднак неабходна адзначыць, што металы работы перадавых таварышаў слаба яшчэ перадаюцца ўсім рабочым.

На заводзе ёсць усе ўмовы для датэрміновага выпуску запчастак. Неабходна толькі ліквідаваць унутрыцэхавыя непаладкі і тормазы, шырока разгарнуць стаханаўскі рух і соцыялістычнае спаборніцтва—і кіраўцы, якія не раз даказвалі сваю самаадданую работу па выкананню баявых урадавых заданняў, з гонарам справяцца з гэтай адказнай задачай.

С. БРАЙНІН.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

(ХРОНІКА)

АРМЕЙСКІЯ КОМСАМОЛЬЦЫ-АКТЫВІСТЫ ВЫЛУЧАЮЦЦА НА АДКАЗНУЮ РАБОТУ

Рашэнне Цэнтральнага Камітэта комуністычнай партыі большэвікоў аб вылучэнні лепшых, праверaных комсамольцаў на адказную палітычную работу знайшло гарачы водгук у часці, дзе камісарам тав. Васільеў.

Зараз камандаванне гэтай часці разгарнула велізарную работу па падбору энергічных, праверaных комсамольцаў намеснікамі і памочнікамі палітрукаў. У палкавой школе, дзе начальнікам капітан тав. Гарбіцкі, памочнікам палітрука вылучан курсант гэтай школы, вылатнік баявой і палітычнай вучобы, актыўны масавік, комсамолец тав. Г. А. Шаранкаў.

— Я не магу знайсці тых слоў, якімі-б магчыма было адзякаваць партыю і вялікага настаўніка, любімага бацьку і друга Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна за праяўленыя бацькаўскія клопаты аб комсамоле, аб усёй совецкай моладзі. У адказ на такія клопаты я прыкладу ўсе намаганні, зтольнасці і веды, каб пяспынна выхоўваць байцоў у духу марксізма-ленінізма, у духу бязмежнай адданасці соцыялістычнай радзіме і вялікай партыі Леніна—Сталіна.

У падраздзяленні, якім камандуе старшы лейтэнант тав. Рындзін, памочнікам палітрука вылучан вылатнік баявой і палітычнай вучобы, малодшы камандзір, актыўны комсамолец тав. Чэхуноў. За час службы тав. Чэхуноў не мае ні аднаго спагнання, прыкладны камандзір, мае некалькі падзяк, занесен на дошку гонару пры часці. Тав. Чэхуноў з самага пачатку свайго прабывання ў Чырвонай Арміі з'яўляецца комсоргам комсамольскай пярвічнай арганізацыі.

Цяпер партыйная і комсамольская арганізацыі часці вылучаюць лепшых комсамольцаў памочнікамі палітрукаў, якія апраўдалі з гонарам званне бойцоў Чырвонай Арміі. Гэта яшчэ раз паказвае сілу і непераможнасць Чырвонай Арміі, з'яўляецца лепшым падарункам партыі і ўраду да 20-й гадавіны слаўнай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

А. КІРЫЛАЎ,
І. РЭДЗІН.

ЭКСКУРСІЯ Ў МУЗЕЙ ЛЕНІНА

ГОМЕЛЬ. У Доме партыйнага актыву рэгулярна працуе семінар сакратароў парткомаў, дырэктароў прадпрыемстваў і парторгаў. Вучобай ахоплена 140 чалавек. Заняткі адбываюцца 3 разы ў месяц з адрывам ад вытворчасці. Семінар мае 4 групы, у якіх слухачы глыбока вывучаюць гісторыю большэвіцкай партыі і эканомгеаграфію. Уводзіцца таксама вывучэнне гісторыі Расіі.

Культпроп гаркома партыі арганізаваў экскурсію слухачоў семінара партактыва ў Маскву ў музей Уладзіміра Ільіча Леніна. У ёй прымуць удзел 50 чалавек. Таварышы азнаёмяцца з слаўным жыццём генія чалавецтва, рэволюцыйным дзейнасцю арганізатара большэвіцкай партыі В. І. Леніна.

ПАГРАНІЧНІКІ ВЫВУЧАЮЦЬ ГІСТОРЫЮ ВКП(б)

Паліталдзел пагранічных і ўнутраных войск НКВД Беларускай акругі правёў у Менску семінар па вывучэнню гісторыі ВКП(б) для памочнікаў камандзіраў часцей па палітчасці, інструктароў прапаганды і камандзіраў асобных часцей — кіраўнікоў марксісцка-ленінскай вучобы каманднага састава. З пагранічных застаў, часцей з'ехаліся на заняткі каля 50 чалавек. На працягу 15 дзён прападавана 7 тэм, якія ахопліваюць перыяд гісторыі партыі да пачатку грамадзянскай вайны.

У ліпені намечана другая чарга семінара з тым, каб поўнасцю закончыць праграму вывучэння гісторыі ВКП(б).

СПАБОРНІЦТВА ПАГРАНІЧНІКАЎ

ЗАХОДНЯЯ ГРАНІЦА СССР. У пагранічнай часці, дзе камісарам тав. Хурцін, шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва імя 20-годдзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Байцы спаборнічаюць за лепшыя паказальнікі ў вучобе і службе, за вартую сустрэчу слаўнай гадавіны.

Кожную пяцідзенку на заставах падводзяцца вынікі спаборніцтва. Імёны вылатнікаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі заносяцца на спецыяльныя лошкі, аб гэтых вылатніках пішуць шматтыражка і «Ільічоўкі».

Вядомасцю карыстаецца чырвонаармеец тав. Ахметшын. Ён за час сваёй службы затрымаў рад парушальнікаў граніцы і быў неаднаразова прэміраваны каштоўнымі падарункамі. Тав. Ахметшын — комсамолец, падаў заяву аб прыёме ў партыю. Булучы намеснікам старшыні ўчастковай выбарчай камісіі, ён правёў значную работу па прапагандзе сярод выбаршчыкаў Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах.

Як вылатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі вызначыў сябе чырвонаармеец, комсамолец тав. Ганчароў. За час сваёй службы ён не меў ніводнай заўвагі. Вылатнік-чырвонаармеец тав. Пятроў за затрыманне парушальніка граніцы ўзнагароджан камандаваннем галзіннікам.

Ва ўсіх падраздзяленнях часці распрацаваны планы падрыхтоўкі і святкавання 20-годдзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. У планы ўключана правядзенне сямі гутарак аб гераічным шляху Чырвонай Арміі і аб яе стваральніках і арганізатарах бліскучых перамог Чырвонай Арміі — таварышах Леніну і Сталіну. Наладжваюцца даклады ўдзельнікаў грамадзянскай вайны.

Рыхтуецца і мастацкая самадзейнасць пагранічнікаў. Чырвонаармеец Шостак у падарунак слаўнаму юбілею намаляраў карціну «Пагранічны нарад разам са службовым сабакам праследуе парушальніка». Цяпер ён рыхтуе карціну: «Кавалерыйская атака».

Падрыхтоўваюцца вечары з выступленнямі струннага аркестра, дэкламатараў, спевакоў, плясуноў.

Пагранічнікі вылучылі 18 прапагандыстаў для правядзення даклада аб 20-годдзі слаўнай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота сярод калгаснікаў.

ПЕРАМОЖЦЫ СТРАЛКОВЫХ СПАБОРНІЦТВАЎ

Усесаюзны камітэт па справах мастацтваў правёў у гонар XX гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота ўсесаюзныя завочныя стралковыя спаборніцтвы, у якіх удзельнічалі студэнты 29 навучальных устаноў, падпарадкаваных Камітэту, у тым ліку Беларуская дзяржаўная кансерваторыя.

Першае месца ў спаборніцтвах занялі стралкі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

Студэнт вакальнага аддзялення кансерваторыі т. Васільчанка з мелкакаліберай вінтоўкі на дыстанцыі 25 метраў выбіў 50 ачкоў з 50 магчымых, студэнты тт. Сеткевіч і Шаес — па 49 ачкоў кожны.

НАСУСТРАЧ XX ГАДАВІНЕ РСЧА

КАНЦЭРТЫ БЕЛДЗЯРЖФІЛАРМОНІІ

Калектыў работнікаў Беларускай Дзяржаўнай філармоніі прыняў зварот трох ордэнаносных тэатраў Масквы і ўключыўся ў актыўную падрыхтоўку да 20-й гадавіны РСЧА.

Усе творчыя калектывы філармоніі прынялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы. З 5 лютага па 1 сакавіка будзе дадзена не менш 15 канцэртаў для часцей Чырвонай Арміі як у г. Менску, так і ў раёнах БССР. 18 лютага сіламі артыстаў Гастрольбюро будзе дадзен раённі канцэрт для часцей гарнізона. 20 і 21 лютага будуць наладжаны чатыры канцэрты ў аддаленых раёнах БССР. 22 лютага арганізуюцца два канцэрты, — адзін для палшэфнага палка, а другі—у Менску. 23 лютага два канцэрты будуць даны для часцей Менскага гарнізона, у якіх прымуць удзел усе творчыя калектывы Белдзяржфілармоніі. 24 лютага адбудзецца канцэрт для часцей РСЧА і НКВД, а 27 лютага ў менскім Доме Чырвонай Арміі імя Варашылава будзе дадзен вялікі канцэрт пры ўдзеле сімфанічнага аркестра і салістаў-спевакоў.

Для дапамогі чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці вылучаны з усіх калектываў кваліфікаваныя кіраўнікі: Алексютовіч, Сакалоўскі, Бары, галоўны дырыжор Мусін і інш. Праграмы выступленняў брыгад распрацоўваюцца.

27 лютага Дзяржфілармонія арганізуе вечар-сустрэчу з палшэфнаю часцю, дзе будзе зроблен даклад аб дасягненнях Чырвонай Арміі за 20 год, а таксама будуць паказаны ўрыўкі з араторыі на тэмы пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну.

У парадку пастаяннай культшэфскай работы Белдзяржфілармонія штомесяц арганізуе, па лініі Універсітэта музыкальнай культуры, канцэрты-лекцыі для часцей Чырвонай Арміі.

Па ўсіх цэхах разгорнута соцспаборніцтва па ўзятых на сябе абавязацельствах на лепшую падрыхтоўку да 20-годдзя Чырвонай Арміі.

Калектыў работнікаў філармоніі выклікаў на соцспаборніцтва калектыў работнікаў Белдзяржтэатра оперы і балета на лепшую падрыхтоўку і правядзенне 20-й гадавіны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота і на лепшую пастаноўку культшэфскай работы.

С. М. БЯЛЯЕЎ

Загадчык АКПО ЦК КП(б)Б

РАШЭННЕ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б)— ДАКУМЕНТ СТАЛІНСКАЙ МУДРАСЦІ

Студзеньскі Пленум ЦК ВКП(б) з усёй большэвіцкай глыбінёй ускрыў памылкі партарганізацый пры выключэнні комуністаў з партыі і ўказаў на фармальна-бюракратычныя адносіны з боку партыйных арганізацый да апеляцый выключаных з радоў партыі.

Партыйныя арганізацыі Совецкай Беларусі не з'яўляюцца выключэннем. Усе памылкі, якія адзначаны ў рашэннях студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б), поўнасцю адносяцца і да нашых партыйных арганізацый. Гэта ў усёй большэвіцкай праматой адзначыў у сваіх рашэннях апошні Пленум ЦК КП(б)Б.

Партарганізацыі Беларусі пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) прарабілі велізарную работу па ачышчэнню сваіх радоў ад трапкісцка-зіноўеўскіх, бухарынскіх і нацыяналістычных агентаў фашызма. Але перамогі партыі былі-б яшчэ большымі, калі-б партыйныя арганізацыі не дапусцілі памылак пры выключэнні з партыі асобных комуністаў.

Ворагі народа, арудаваўшыя ў некаторых акруткомах, гаркомах і райкомах, каб утаіць свой контррэволюцыйны твар, выключалі з партыі чэсных людзей, знеслаўлялі дастойных, ні ў чым не вінаватых комуністаў.

Партыйныя арганізацыі не ўлічылі неаднаразовых указанняў ЦК ВКП(б) аб чулых, уважлівых адносінах да лёсу членаў партыі, аб сур'ёзных адносінах да апеляцый выключаных. Гэты большэвіцкі прынцып быў забыт многімі партыйнымі арганізацыямі, і яны без усебаковай праверкі кампраметуючых матэрыялаў агулам выключалі з партыі чэсных людзей.

У менскай гарадской партыйнай арганізацыі выключана з партыі вялікая колькасць комуністаў, сярод якіх нямала аказалася ворагаў народа, якія із'яты органамі НКВД. Разам з тым ворагі народа, якія раней сядзелі ў кіраўніцтве гаркома, выключалі з партыі чэсных комуністаў, каб захаваць свае варожыя кадры.

Бюро менскага гаркома, ліквідуючы вынікі шкодніцтва, дэтальна праверыўшы матывы выключэння на 56 чалавек, аднавіла ў радах 26 таварышаў, як няправільна выключаных. Апрача гэтага, намечана яшчэ пераглядзець у бліжэйшы час 110 спраў выключаных ворагамі народа, як-быццам па матывах «пасіўнасці», палітычнай малапісьменнасці і за іншыя незначныя праступкі.

Па магілеўскай гаралской партыйнай арганізацыі былы сакратар гаркома, зараз выкрыты і арыштаваны органамі НКВД, як вораг народа, маскуючы свае варожыя дзеянні, дзесяткамі выключаў чэсных комуністаў з партыі. Толькі на адным пасяджэнні бюро гаркома 21 жніўня 1937 года было выключана з радоў партыі ў адзін прыём 23 чалавекі. Новае кіраўніцтва гаркома партыі 26 студзеня разглядзела 11 апеляцый гэтых комуністаў і аднавіла ў партыі 9 таварышаў.

Вораг народа, пралезшы ў магілеўскі гарком, дабіўся выключэння з партыі тав. Нікіна па матывах, што той наведаў магазін, як пакупнік, дзе быў за прылаўкам выкрыты зараз трацкіст. У партарганізацыі чыгункі выключылі з партыі тав. Скворцына за тое, што ён, будучы прарабам падначаленай яму брыгады, даў капя перавезці бульбу жонцы выключанага з партыі і арыштаванага. Член партыі з 1930 года тав. Савіч выключан з партыі, і ў пастанове гаркома было напісана ўсё, што толькі можна напісаць. Яго абвінавачвалі ў школьніцтве, сувязях з ворагам народа, п'янках і ігнараванні стаханаўскага руху. Праверкай устаноўлена, што ні адно з гэтых абвінавачанняў не пацвердзілася.

Пры выключэнні з партыі ў гомельскай гаралской арганізацыі рад пярвічных партыйных арганізацый і сам гарком дапускалі фармальна-бюракратычныя адносіны да лёсу членаў партыі. Партком Упраўлення Беларускай чыгункі на адным партсходзе на працягу поўгадзіны выключыў з партыі 10 чалавек, з якіх 9 гаркомам былі адноўлены ў правах членаў партыі.

Гомельскі гарком выключыў з партыі тав. Хесіна Я. К., як бундаўца. Пры дэтальным расследванні гэтай справы ўстаноўлена, што заява падана па абвінавачанню яго ў прыналежнасці да бунда на падставе таго, што адзін грамадзянін бачыў калісьці, як тав. Хесін ішоў па вуліцы з адным бундаўцам, а таму яму здалося, што т. Хесін належыць да бунда. На падставе гэтай паклёпніцкай заявы т. Хесіна выключаюць з партыі. Зараз, пры праверцы паступіўшых кампраметуючых матэрыялаў, абвінавачанне тав. Хесіна не пацвердзілася, і ён адноўлен у правах члена партыі.

Выключан з партыі тав. Грамыка Павел Іванавіч, член партыі з 1928 года. Працаваў ён сакратаром парткома гурмы. Абвінавачвалі яго ва ўтойванні соцпахождання. Пераконвалі тав. Грамыка, што яго бацька да 1891 года меў 20 га зямлі. Праверкай устаноўлена, што яго бацька доўгі час займаўся адыходніцтвам, ніякай гаспадаркі сваёй не меў. Такім чынам паклёпнікі знеслаўлялі члена партыі. Тав. Грамыка таксама адноўлен у партыі.

Партарганізацыя Полацкага педвучылішча ў 1937 годзе выключыла з партыі тав. Дзянісава — члена партыі з 1919 года, працаваўшага загадчыкам вучэбнай часткай педвучылішча. Абвінавачвалі яго ў наступным: «За дапушчэнне ў выкладанні буржуазнай педагогікі зажым крытыкі і за антысовецкія вылазкі». Пры разглядзе гэтай справы ў партколегіі пры ўпаўнаважаным КПК па БССР устаноўлена, што тав. Дзянісаў быў выключан з партыі па хлуслівых, паклёпніцкіх заявах, сфабрыкаваных па прамому ўказанню былога культпропа полацкага акруткома, які зараз арыштаваны органамі НКВД, як вораг народа.

Абураючыя адносіны да лёсу комуністаў, фармальна-бюракратычны падыход да разгляду апеляцый уласцівы бабруйскаму і барысаўскаму райкомам, слуцкаму акруткому і іншым партыйным арганізацыям.

Пленум ЦК ВКП(б) патрабаваў ад партарганізацый уважлівых і чулых адносін да разгляду апеляцый. Аднак, гэтыя зусім ясныя ўказанні яшчэ недастаткова выконваюцца. Гэта пацвярджаецца тым, што ў партарганізацыях не разглядзена звыш 1.000 апеляцый, паданых на імя акруткомаў, гаркомаў і райкомаў.

Недапушчальная маруднасць, зацяжка ў разглядзе апеляцый стварае бюракратычную пяганіну. Людзі па некалькі разоў зварачаюцца ў партыйныя органы, каб атрымаць канчатковы адказ аб вырашэнні пытання аб партыйнасці. Нельга мірыцца з такім становішчам, калі ў менскім, гомельскім гаркомах, мозырскім, слуцкім акруткомах, барысаўскім, аршанскім райкомах ляжаць па некалькі дзесяткаў неразглядзеных апеляцый.

Пленум ЦК КП(б)Б патрабаваў ад усіх партыйных арганізацый, у тым ліку і ад АКПО ЦК КП(б)Б, самым сур'ёзным, самым уважлівым чынам, ва ўстаноўлены Пленумам ЦК ВКП(б) тэрмін разглядзець усе апеляцыі выключаных з партыі. Пара пакончыць раз назаўсёды з той безадказнасцю, якая яшчэ існуе ў адносінах вырашэння пытання аб партыйнасці. Нярэдкі выпадкі, калі такія партыйныя справы перадаваяраюцца інструктарам, а сакратар райкома і іншыя члены бюро самаўхіляюцца ад адказнай работы па вырашэнню партыйнасці комуністаў.

Пленум ЦК ВКП(б) указвае партыйным арганізацыям на недапушчальнасць лёгкадумных адносін да выключэння з партыі. За ўсякае беспадстаўнае абвінавачанне трэба паклёпнікаў, кар'ерыстаў-комуністаў, самастрахоўшчыкаў, якія імкнуцца выслужыцца на выключаных з партыі, выкрываць і прыцягваць да адказнасці.

Партыйныя арганізацыі абавязаны неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі. Пленум ЦК КП(б)Б патрабаваў ад партыйных арганізацый неадкладна пераглядзець справы выключаных за пасіўнасць і за малаважныя праступкі ў часе праверкі і абмену партыйных дакументаў.

Адноўленым у партыі акруткомы, гаркомы і райкомы партыі абавязаны ставрыць усе ўмовы, каб яны народні з астатнімі членамі партыі ўцягваліся ў актыўнае партыйнае жыццё, пакончыўшы з цяганінай, зацяжкай у вылачы партдакументаў. Пленум ЦК КП(б)Б прапанаваў партыйным арганізацыям неадкладна праверыць, хто з выключаных яшчэ не мае работы і праз совецкія і гаспадарчыя ўстановы забяспечыць ім работу. Партыйныя арганізацыі абавязаны рашуча пакарань самастрахоўшчыкаў, якія пад рознымі прычынамі адмаўляюцца прадаставіць работу людзям выключаным з партыі.

Рашэнні Пленума ЦК КП(б)Б з усёй сур'ёзнасцю ставяць задачу перад партыйнымі арганізацыямі аб разгортванні палітычнай работы па ўцягненню лепшых людзей у рады партыі. Трэба з усёй рашучасцю палкрэсліць, што ўказанні ЦК ВКП(б) партыйныя арганізацыі Беларусі не выканалі. За ўвесь 1937 год па менскай гарадской партарганізацыі прынята ў кандыдаты партыі толькі 37 чалавек і пераведзена ў члены 77. Горрайкомы партыі, якія маюць надзвычай вялікі рэзерв у асобе стаханаўцаў, комсамольцаў, справу прыёму ў партыю пусцілі на самацёк і таму Варашылаўскі райком прыняў у кандыдаты 10 чал., Кагановіцкі — 8 чал. і Сталінскі — 19 чал.

Нецярпімыя адносіны да папаўнення радоў партыі лепшымі людзьмі праяўляюць і іншыя партыйныя арганізацыі. Напрыклад, бабруйская раённая партыйная арганізацыя за ўвесь 1937 год прыняла ў кандыдаты партыі толькі 4 чалавекі і пераняла ў члены 23 таварышы. Барысаўская партарганізацыя за 1937 год і пачатак 1938 прыняла ў рады партыі толькі 22 чал. У радзе партыйных арганізацый пануюць сярод асобных комуністаў антыпартыйныя разважанні, што нельга даваць ражаменданыі, баючыся, як-бы чаго не вышла. Самастрахоўка, абыякавыя адносіны да вырасшых людзей з'яўляецца справай глыбока антыпартыйнай.

Выбарчая кампанія ў Вярхоўны Совет СССР выявіла дзесяткі тысяч таленавітых, адольных беспартыйных актывістаў. Гэтых людзей неабходна вылучаць на адказныя кіруючыя работы. Пленум ЦК КП(б)Б з усёй рашучасцю паставіў задачу перад акруткомамі, гаркомамі і райкомамі — вылучаць маладых, праверaных, вырасшых беспартыйных актывістаў. Нецярпімы такое становішча, калі ў менскіх горрайкомах не ўкамплектаван інструктарскі апарат, няма другіх і трэціх сакратароў райкомаў. Такое-ж становішча і ў цэлым радзе іншых партыйных арганізацый.

Рашэнне Студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) з'яўляецца велізарнай важнасці палітычным дакументам у жыцці нашай партыі. Задача кожнага кіраўніка, кожнага комуніста па-большэвіцку глыбока вывучыць гэты дакумент і ў практычнай рабоце забяспечыць яго поўнае выкананне. Гэта рашэнне з велізарнай сілай узброівае кожнага з нас на яшчэ большую непрымірымую барацьбу з ворагамі.

Партыйная арганізацыя Беларусі пад кіраўніцтвам ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта, пад асабістым кіраўніцтвам любімага правадыра, друга, бацькі працоўных усяго свету таварыша Сталіна разграміла фашысцкую банду. Нашы задачы — да канца выкарчаваць ворагаў партыі і совецкага народа, як-бы яны майстэрска ні маскаваліся.

Рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) мабілізуюць партыйную арганізацыю, кожнага комуніста на яшчэ большае павышэнне большэвіцкай пільнасці, на актыўную барацьбу за выкананне грандыёзных планаў соцыялістычнага будаўніцтва.

СУСТРЭЧЫ ДЭПУТАТАЎ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР З ВЫБАРШЧЫКАМІ

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). 2 лютага тэатральную залу чыгуначнага клуба імя Леніна запоўнілі байцы, камандзіры і палітработнікі часцей Гомельскага гарнізона. Прышлі таксама і жонкі камандзіраў. Прысутныя цёпла сустрэлі дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР тт. Аляксея Аляксеевіча Волкава і Міхаіла Цімафеевіча Фінагенава.

З дакладам аб рабоце першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР выступіў дэпутат і член Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР выконваючы абавязкі першага сакратара ЦК КП(б)Б тав. А. А. Волкаў.

Вечарам тав. А. А. Волкаў выступіў з дакладам аб рабоце Сесіі на агульнагаралскім сходзе рабочых, служачых, інжынерна-тэхнічных работнікаў. На сходзе прысутнічала 1500 чалавек.

З вялікім натхненнем, пад бурныя воплескі сход паслаў прывітальныя пісьмы вялікаму Сталіну і яго баявым сратнікам таварышам В. М. Молатаву, М. І. Калініну і К. Е. Варашылаву.

***

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). 2 лютага адбыўся сход працоўных Даўжанскага сельсовета. Удзельнікі сходу цёпла сустрэлі дэпутата Вярхоўнага Совета СССР, старшыню СНК БССР тав. А. Ф. Кавалёва, які выступіў з дакладам аб рабоце першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР.

Сход пад бурныя авацыі паслаў прывітальную тэлеграму вялікаму правадыру народзіў таварышу Сталіну.

У гэты-ж дзень тав. Кавалёў зрабіў даклад аб рабоце Сесіі Вярхоўнага Совета на шматлюдным сходзе працоўных Бараўлянскага сельсовета.

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА СОВЕТА САЮЗА ВАЯЎНІЧЫХ БЯЗБОЖНІКАЎ

МАСКВА, 1 лютага. (БЕЛТА). Сёння адкрыўся 4-ты расшыраны пленум Цэнтральнага совета саюза ваяўнічых бязбожнікаў СССР.

На парадку дня пленума справаздачны даклад аб рабоце Цэнтральнага совета саюза, справаздачы арганізацый саюза ваяўнічых бязбожнікаў Украіны, Грузіі, Ленінграда, Іванаўскай вобласці і Казахстана, абмеркаванне праекта статута саюза, выбары кіруючых органаў.

Са справаздачным дакладам аб рабоце Цэнтральнага совета саюза ваяўнічых бязбожнікаў выступіў адказны сакратар совета тав. Алешчук.

ХРОНІКА

У рэзультаце меўшых месца дыпламатычных перагавораў, ураламі СССР і Турцыі прынята рашэнне, згодна якога з 31 сакавіка г. г. закрываюцца консульствы СССР у Ізміры і Карсе і консульствы Турцыі ў Одэсе, Баку, Ерэване і Ленінакане і астаюцца па аднаму консульству з кожнай стараны на тэрыторыі другой, а іменна — совецкае консульства ў Стамбуле і турэцкае консульства ў Батумі. (БЕЛТА).

ЗА СТАЛІНСКІЯ 7—8 МІЛЬЯРДАЎ ПУДОЎ ЗЯРНА Ў ГОД, ЗА ВЫСОКІЯ ЎРАДЖАІ ЎСІХ КУЛЬТУР!

Да ўсіх калгаснікаў і калгасніц, рабочых соўгасаў, трактарыстаў, камбайнераў, аграномаў, работнікаў МТС і зямельных органаў

Дарагія таварышы!

Разам з усёй совецкай краінай мы дастойна сустрэлі выбары ў Вярхоўны Совет СССР.

Нашы станіцы спрадвеку не бачылі такога выдатнага свята радасці і гордасці народнай.

99,4 процанта выбаршчыкаў Шчэрбінаўскага раёна з'явіліся на выбары. Мы галасавалі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, гэта значыць за партыю большэвікоў, за справу Леніна—Сталіна, за далейшае працвітанне калгасаў і заможнае, культурнае жыццё калгаснікаў.

Мы даўно пакінулі ззаду дакалгасны ўзровень ураджаяў. У прайшоўшым годзе па асноўнай культуры — азімай пшаніцы шчэрбінаўскія калгасы сабралі ў сярэднім амаль па 15 цэнтнераў з гектара.

7 кілограмаў зярна і 2 рублі 20 капеек грашыма — вось колькі важыць ў сярэднім па раёну калгасны працадзень.

Багатая кубанская зямля была мачахай для казачай беднаты. Роднай маткай яна стала для калгаснікаў.

Давайце-ж, таварышы, працаваць яшчэ лепш, яшчэ больш дружна, каб у наступіўшым годзе памножыць нашы дасягненні!

Мы заклікаем вас уступіць у спаборніцтва, каб 1938 год стаў годам далейшага росквіту, сацыялістычнай сельскай гаспадаркі.

ЗА ШТО НАШ РАЁН БУДЗЕ ЗМАГАЦЦА Ў 1938 ГОДЗЕ

На калгасных сходах і на раённым злёце стаханаўцаў мы парашылі змагацца ў 1938 годзе:

за 21 цэнтнер каласавых з гектара ў сярэднім па раёну;

за 3 мільёны пудоў валавога збору зярна;

за 10 кілограмаў хлеба і 3 рублі грашыма на працадзень.

Сілы ў нас многа, воля да перамогі вялікая, і сваю задачу мы выканаем з гонарам.

Ужо ў 1937 годзе валавы збор зярна склаў у раёне 2 мільёны 280 тысяч пудоў. Лепшыя нашы стаханаўцы-брыгадзіры з участкаў у дзесяткі гектараў сабралі па 50—60—70 і больш цэнтнераў пшаніцы з гектара. Цяпер яны абавязваюцца сабраць рэкордныя ўраджаі на масівах па 100 і больш гектараў. Мы прыкладзем усю сваю стараннасць і сілы да таго, каб вопыт нашых стаханаўцаў быў успрыняты ўсімі звеннямі, брыгадамі і калгасамі.

Мы падцягнем і ўраджаі прапашных культур. 30 цэнтнераў кукурузы, 12 цэнтнераў сланечніку і 8 цэнтнераў неабвадняемай бавоўны з гектара ў сярэднім па раёну — вось наша абавязацельства на 1938 год.

4 тысячы гектараў на трактар «ЧТЗ», 1.200 гектараў на трактар «СТЗ», 700 гектараў на «Універсал», 450 гектараў на камбайн «Комунар» і 600 на «Сталінец» — вось за што будуць змагацца нашы вадзіцелі машын.

У тэрмін і лепшым зярном мы выканаем у 1938 годзе першую запавець — пастаўкі хлеба дзяржаве і натуральную аплату работ машынна-трактарных станцый.

Такія нашы абавязацельствы, такія нашы планы на 1938 год. Мы будзем за іх нястомна змагацца, мы выканаем іх з гонарам.

ВЫЙДЗЕМ НА ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ ВА ЎСЕУЗБРАЕННІ

У нас многа машын, выраслі выдатныя кадры вадзіцеляў. Ёсць усе ўмовы для таго, каб пасеяць добра і быстра.

Мы абавязваемся пасеяць яравую пшаніцу, ячмень, авёс і сланечнік за чатыры рабочыя дні. Сяўбу кукурузы і бавоўны закончым за пяць рабочых дзён. Да 10 мая закончым падняцце 8 тысяч гектараў папару.

Нашы трактарысты з першых гадзін палявых работ па-стаханаўску загрузяць культыватары і сеялкі.

Рашэнне Соўнаркома СССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) «Аб ходзе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы» дае нам, як і ўсім іншым раёнам совецкай краіны, баявую праграму барацьбы за сталінскі ўраджай.

Нашы МТС абавязваюцца адрамантаваць трактары так, каб яны працавалі, як гадзіннік. Спецыялісты, трактарысты спаборнічаючых МТС будуць узаемна правяраць якасць рамонту кожнай машыны. Ні хвіліны прастою на полі з-за няспраўнасці трактара ці прычэпаў!

Сеялкі, культыватары, лушчыльнікі і іншы прычэпны інвентар мы ўжо падрыхтавалі. Заканчваем рамонт плугоў.

Па-стаханаўску ў дзве змены загрузім трыеры, сартыроўкі і веялкі, каб у бліжэйшыя дні ўсё насенне прывесці ў поўную гатоўнасць. Нашы аграномы, інспектары па якасці, лепшыя калгаснікі гаспадарскім вокам праверуць у кожным калгасе, у кожным насенным свірне якасць насення. Мы зробім усё, каб насенныя фонды былі сапраўды залатым фондам ураджаю.

Для падкормкі азімых і ўгнаення бавоўняніка загатаўляем гноевую жыжу, птушыны памёт, печны попел і фекаліі, ва ўсіх калгасах арганізуем добрыя гноехавальнікі. Поўнасцю скарыстаем мінеральныя ўгнаенні, адпушчаныя дзяржавай.

Мы зноў ва ўсіх калгасах вылучаем інспектараў па якасці, якіх там-сям незаслужана забылі.

Нашы аграномы абавязваюцца на справе стаць арганізатарамі перадавой стаханаўскай агратэхнікі ў брыгадах і калгасах.

У кожным калгасе, брыгадзе і звяне зараз кіпіць работа. Па-гаспадарску рыхтуем усё — аж да віл, грабляў, чысцікаў, ланцугоў, вяровак.

Цяпер мы ўжо не настолькі бедныя на кадры, каб на адказныя ўчасткі ставіць людзей, недастаткова авалодаўшых тэхнікай. Мы правяраем перад вясной у кожным калгасе агратэхнічную праверку прычэпшчыкаў, сеялыпчыкаў, хімізатараў, яравізатараў, конюхаў. Праверка гэта дазволіць нам падабраць на рашаючыя ўчасткі сапраўды лепшых людзей, сапраўдных знатакоў справы, на якіх можна будзе смела пакласціся.

ВЫШЭЙ СЦЯГ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА

Чатырыста агітатараў, многія з якіх выраслі ў перыяд падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет, увесь калгасны актыў, усе партыйныя і непартыйныя большэвікі панясуць сцяг спаборніцтва ў калгасныя масы.

У кожным калгасе і станічным совеце, у трактарных і калгасных брыгадах устанаўляюцца дошкі з паказальнікамі спаборніцтва.

Раённая газета і насценныя газеты калгасаў будуць пастаянна асвятляць ход спаборніцтва, ход падрыхтоўкі да сяўбы, каб кожнаму калгаснику было відаць — хто адстае і хто наперадзе, каб рады ўдарнікаў і стаханаўцаў безупынна раслі.

Раённы камітэт партыі і раённы выканаўчы камітэт устанаўляюць пераходныя сцягі для перадавікоў спаборніцтва — асобных калгасаў, брыгад і звенняў.

Удзел ва Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы будзе ганаровай узнагародай для калгасаў, якія даб'юцца найвышэйшых ураджаяў.

Таварышы калгаснікі, трактарысты і камбайнеры, аграномы і механікі, кіраўнікі калгасаў і МТС!

Вышэй падымем сцяг соцыялістычнага спаборніцтва на калгасных палях!

Мы зварачаем свой голас перш за ўсё да калгаснікаў, аграномаў, кіраўнікоў нашага Краснадарскага края і іншых паўднёвых раёнаў Совецкага Саюза.

— Таварышы! Мы першымі ў краіне пачынаем сяўбу. Будзем гатовы да ранняй і дружнай вясны! Сустрэнем яе ва ўсеўзбраенні!

Няхай 1938 год стане годам новых бліскучых перамог социялістычнага земляробства. Чым вышэй ураджай, тым багацей стане калгасная вёска, тым яшчэ больш вырасце магутнасць нашай вялікай радзімы.

Узмоцнім большэвіцкую пільнасць! Будзем выкрываць і знішчаць ворагаў народа —трацкісцка-зіноўеўскіх і бухарынска-рыкаўскіх наймітаў япона-германскага фашызма. Будзем бязлітаснымі да ўсіх, хто асмеліцца пасягнуць на шчасце і мірную працу совецкага народа.

Цясней згуртуемся вакол непераможнага сцяга Леніна—Сталіна!

Высокім ураджаем 1938 года будзем рапартаваць ураду, партыі, таварышу Сталіну, што лозунг — вытвараць штогод 7—8 мільярдаў пудоў зярна — паспяхова выкананы.

Мы просім наркома земляробства Саюза ССР і рэдакцыі газет «Правда», «Социалистическое земледелие» і «Крестьянская газета» быць арбітрамі нашага спаборніцтва.

Стаханаўцы сельскай гаспадаркі, кіраўнікі раёна, калгасаў, работнікі МТС і спецыялісты Шчэрбінаўскага раёна, Краснадарскага края.

(205 подпісаў).

На лесазагатоўках

РЭЗУЛЬТАТ ДРЭННАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ

БАБРУЙСК. Брожскі механізаваны лесапункт — адзін з буйнейшых у трэсце Лесбел — зрывае выкананне важнейшага дзяржаўнага задання. На 25 студзеня тут вывезена ўсяго 9,6 тыс. кубаметраў драўніны, што складае 12,8 проц. квартальнага плана.

Начальнік пункта тав. Навіцкі зусім не клапоціцца аб фарсіраванні работ у лесе. Прыбыўшыя 20 калгаснікаў з Варатынскага і Цялушскага сельсоветаў на лесазагатоўкі два дні знаходзіліся без справы на пункце і ні з чым паехалі дамоў. Навіцкі ніяк не мог знайсці машыны для адпраўкі людзей у лес.

Начальнік пункта не ведае сваіх стаханаўцаў, не цікавіцца іх работай. Вопыт перадавікоў не распаўсюджваецца. Старшыня рабачкома тав. Корэун ні разу не быў у лесе.

Зусім дрэнна працуе трактарная калона. У часе перавозкі драўніны з лесу да станцыі Брожы па дарозе павыкідалі да двух вагонаў лесу, які раскралі. Трактары выходзяць у лес няспраўныя, без грузчыкаў, у рэзультаце яны прастайваюць па 8 гадзін і больш.

Не зусім добра абстаіць справа з тэхнікай безапаснасці. На працягу снежня і студзеня тут было некалькі выпадкаў пакалечання людзей.

На мехпункце арудуе шайка жулікаў, якая раскрадзе сотні кубаметраў дроў. Навіцкі чамусьці не лічыць патрэбным выкрыць гэтых зладзеяў.

ЛЕСАВІК.

—о—

ВЫВЕЗЛІ... 4 КУБАМЕТРЫ ЛЕСУ

Загатоўка і вывазка лесаматэрыялаў па Шацкаму лесаўчастку Пухавіцкага леспрамгаса праходзіць яўна незадавальняюча. Лічбы выканання заданняў—вельмі мізэрныя. Кіраўнікі Пухавіцкага, Уэзенскага і Смілавіцкага раёнаў самасупакоіліся, хаця заданні па іх раёнах зрываюцца. Паасобныя сельсоветы яўна бяздзейнічаюць. Узяць хаця-б Залошчанскі сельсовет, Пухавіцкага раёна (старшыня сельсовета тав. Леўчанка). Гэты сельсовет павінен загатовіць 2.500 кубаметраў лесу, а загатовіў усяго толькі 175 кубаметраў. Замест задання па вывазцы 1500 кубаметраў, вывезена толькі... 4 кубаметры.

Трэба адзначыць і тое, што раённы друк мала ўдзяляе ўвагі лесазагатоўкам. На старонках друку амаль адсутнічае матэрыял на гэтую тэму.

НОВІКАЎ.

62 НОВЫЯ ШКОЛЫ Ў БССР

СНК БССР зацвердзіў план школьнага будаўніцтва па рэспубліцы на 1938 год. Будуць пабудаваны 62 новыя школы на 19.400 вучнёўскіх месц, у тым ліку 27 школьных будынкаў у гарадах і 35 — у сельскіх мясцовасцях. Агульны кошт будаўніцтва вызначан у 20.400 тысяч рублёў.

СНК устанавіў тэрмін сканчэння будаўніцтва не пазней 15 жніўня, а тэрмін здачы школьных будынкаў у эксплаатацыю не пазней 20 жніўня.

Будаўніцтва школ будзе праводзіцца па тыпавых праектах Наркамасветы БССР у Менску — Менбудам, а ў астатніх гарадах — Белкомунбудам.

Да 20-й гадавіны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. **На здымку:** рэпрадукцыя з карціны мастака Н. Карпоўскага **«Смерць Шчорса».** (Выстаўка «Квітнеючая Украіна», г. Кіеў). (СФ).

ГЕРОІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

НІКАЛАЙ ШЧОРС

Вясной 1918 года армія германскіх захватчыкаў, пачаўшых першымі інтэрвенцыю супроць краіны Совецкаў, уварвалася на Украіну. Тысячы украінскіх рабочых і сялян па заклику партыі Леніна—Сталіна выступілі са зброяй у руках на абарону радзімы і совецкай улады. Колькі ў гэтыя дні украінскі народ вылучыў герояў — сваіх, адданых пролетарскай рэвалюцыі, сыноў!

Сын паравознага машыніста станцыі Сноўскай, прапаршчык, вярнуўшыйся з фронта імперыялістычнай вайны большэвіком, Нікалай Александравіч Шчорс, не гледзячы на сваю маладосць — яму не было яшчэ 23 год — быстра завяваў сярод украінскіх чырвонагвардзейцаў і партызан громкую славу сваёй бясстрашнасцю, дысцыплінаванасцю і арганізатарскім талентам.

Баявы шлях Шчорса, як народнага героя, пачаўся ў сакавіку 1918 года ў сяле Сямёнаўцы, Новазыбкаўскага павета. Тут быў адзін з цэнтраў, дзе фармаваліся партызанскія атрады Паўночнай Чарнігаўшчыны. Сюды Шчорс прышоў на чале невялікай групы сваіх таварышаў-чыгуначнікаў станцыі Сноўскай. Сярод сямёнаўскіх большэвікоў, фармаваўшых партызанскі атрад, не было людзей, меўшых ваенную падрыхтоўку. Шчорс быў адразу выбран камандзірам атрада.

Праз некалькі дзён у атрадзе налічвалася звыш 300 байцоў. Правёўшы некалькі страявых заняткаў, Шчорс пагрузіў атрад у эшалон і рушыўся з ім у Новазыбкаў.

Тут эшалон быў пакінут, як тылавая база. Шчорс павёў атрад насустрач нямецкім войскам, наступаўшым з боку Гомеля ўздоўж чыгункі.

Уся артылерыя атрада складалася з адной зенітнай гарматы, якую Шчорс хацеў выкарыстаць і для стрэльбы па наземных цэлях. Пры такой «тэхніцы» поспеху можна было дабіцца толькі смелымі, нечаканымі налётамі. Таму Шчорс асабліваю ўвагу звярнуў на кавалерыю. Ён зрабіў у гэтых адносінах усё, што мог. Пры атрадзе была сфармавана конная разведка ў некалькі дзесяткаў сабель. Неўзабаве ёй удалося ўзброіцца захопленымі ў немцаў аўтаматычнымі ружжамі і ручнымі кулямётамі.

Дзейнічаючы ў лясах паміж Новазыбкавым і Гомелем, Шчорс на чале сваёй конай разведкі глухімі лясными тропамі і балкамі часта пранікаў у тыл немцаў і расстрэльваў іх, ашаломленых раптоўным нападам, ледзь не ва ўпор.

Нямецкае камандаванне, раздражонае смелымі налётамі Шчорса, рашыла знішчыць яго маленькі, слаба ўзброены атрад адным сакрушальным ударам, але нечакана для сябе атрымала моцны адпор. У лясах ля пасада Злынкі разгараўся ўпарты бой. Шчорс адбіў удар немцаў, прыпыніў іх наступленне, але рады яго байцоў значна паредзелі. Вярнуўшыся ў Новазыбкаў, ён пры дапамозе мясцовай партыйнай арганізацыі быстра папоўніў атрад добраахвотнікамі і пракладваў барацьбу, стрымліваючы націск немцаў на лініі Новазыбкаў—Клінцы—Унеча.

У канцы красавіка 1918 г., калі нямецкія войскі, аламіўшы супраціўленне разрозненых чырвонагвардзейскіх і партызанскіх атрадаў, захапілі Украіну, Шчорс прыехаў са сваімі бліжэйшымі саратнікамі ў Маскву. У Крэмлі іх прыняў Ленін, уважліва сачыўшы за барацьбой украінскіх партызан з нямецкімі захватчыкамі. Шчорс зрабіў Уладзіміру Ільічу падрабязны даклад. Ён гаварыў аб гераізме партызан, але не ўтойваў і адмоўных бакоў партызанщчыны. З вопыту першых баёў з войскамі нямецкіх акупантаў Шчорс вынес цвёрдае перакананне ў неабходнасці аб'яднання разрозненых партызанскіх атрадаў пад агульным камандаваннем. Гутарка з Леніным дала яму чоткія перспектывы далейшай барацьбы.

У гутарках са сваімі саратнікамі Шчорс пачаў развіваць планы фармавання з украінскіх партызанскіх атрадаў рэгулярных часцей Чырвонай Арміі. У канцы лета, вярнуўшыся на Украіну, ён аддаў усе свае сілы на ажыццяўленне гэтых планаў. Партыя даручыла Шчорсу фармаванне 1-га украінскага совецкага палка, якому неўзабаве прысвоена было імя Багуна — аднаго з герояў барацьбы украінскага народа з польскімі захватчыкамі ў XVII стагоддзі.

Багунскі полк быў сфармаваны ў раёне станцыі Унеча, у нейтральнай зоне, аддзяляўшай Совецкую Расію ад акупаванай немцамі Украіны.

У жніўні 1918 года нейтральная зона стала рэвалюцыйным цэнтрам украінскіх паўстанцаў. Сюды прарываліся скрозь акружэнне нямецкіх войскаў дзесяткі пешых і конных атрадаў украінскіх рабочых і сялян, паўстаўшых супроць акупантаў і іх стаўленіка — гетмана Скарападскага. З гэтых атрадаў фармаваліся палкі двух дывізій. Паўстанцы, залічаныя ў полк Шчорса, адразу-ж адчулі, што ім прыязджа падцягнуцца, моцна ўзяць сябе ў рукі. Шчорс патрабаваў культурнасці ад усіх акружаючых. У гутарках з чырвонаармейцамі і камандзірамі Шчорс часта гаварыў аб бліжэйшым будучым Чырвонай Арміі, як самай магутнай і самай культурнай арміі ў свеце. Заўсёды стрыманы, скупы на словы і гесты, ён загараўся, калі гаварыў аб гэтым.

Стаўшы на чале палка, Шчорс адчуў на сабе велізарную адказнасць. Ён адзівіў усіх сваёй нястомнасцю. Ніхто не ведаў, калі-ж адпачывае гэты заўсёды энергічны, бадзёры, падцягнуты чалавек з яркімі вялікімі шэрымі вачыма і акуратна падстрыжанай чорнай бародкай.

Дзякуючы энергіі і настойлівасці Шчорса Багунскі полк, сфармаваны з партызанскіх атрадаў, вельмі быстра прыняў від рэгулярнай вайсковай часці.

Многім былым партызанам строгія параджі ў палку не падабаліся. Нямецкія шпіёны, шныраўшыя вакол Унечы, прабавалі скарыстаць гэта, каб арганізаваць мяцеж супроць Шчорса. Шчорс быў увесь час на-чаку. Расставіўшы па ротах сваіх старых надзейных саратнікаў, гутарачы па вечарах з чырвонаармейцамі, Шчорс непрыкметна згуртоўваў вакол комуністаў усю здаровую часць палка. І калі купленыя немцамі здраднікі ўзнялі мяцеж, ён быў ліквідаван імгненна. Чырвонаармейцы выкінулі зачынішчыкаў са сваіх радоў. Пасля гэтага Шчорс правёў чыстку палка ад усіх чужых людзей. Застаўшыяся ў палку далі клятву вернасці рэвалюцыі. Шчорс сам склаў тэкст гэтай клятвы і першым падпісаў яе.

Падрыхтоўваючы свой полк да наступлення супроць нямецкіх захватчыкаў, Шчорс адначасова ўстанаўліваў сувязь з разрозненымі партызанскімі атрадамі, якія дзейнічалі на Чарнігаўшчыне. Ён умудраўся адпраўляць да іх і зброю, і літаратуру, і арганізатараў.

Нямецкія заставы стаялі ў некалькіх кілометрах ад Унечы, але камандаванне акупантаў не адважвалася рушыць супроць Шчорса свае войскі, таму што ў тыле іх дзейнічалі дзесяткі няўлоўных, звязаных са Шчорсам, партызанскіх атрадаў.

Кіраўніцтва большэвіцкай партыі і асабіста Леніна і Сталіна, прымаўшых непасрэдны ўдзел у гераічнай барацьбе украінскага народа за совецкую ўладу, забяспечыла украінскім паўстанцам брацкае падтрыманне ўсёй Совецкай Расіі. Дзякуючы гэтаму падтрыманню ўзброеныя сілы украінскіх паўстанцаў хутка раслі.

Полымя народнага паўстання ахоплівала ўсю Украіну. У нямецкіх войсках пачалося рэвалюцыйнае бражэнне. Разам з украінскімі рабочымі і сялянамі ў полк Шчорса пачалі прыходзіць рэвалюцыйныя нямецкія салдаты, рашыўшыя змагацца за совецкую ўладу.

У канцы кастрычніка, скончыўшы абучэнне палка, Шчорс рушыў яго супроць акупантаў. Багунцы разграмілі некалькі нямецкіх гарнізонаў, размешчаных па буйных сёлах уздоўж нейтральнай зоны. У гэты час прышла вестка аб рэвалюцыі ў Германіі. У штаб Багунскага палка з'явілася дэлегацыя нямецкіх рэвалюцыйных салдат. Шчорс сустрэў яе з захапленнем. Ён дакладваў па тэлеграфу Леніну: «Мы аб'ядналіся з нямецкімі салдатамі, харчуемся з адной кухні, немцы і нашы спяваюць інтэрнацыянальны гімн».

Германскае камандаванне, страціўшае сваіх салдат, аддала загад аб эвакуацыі. Нямецкія акупацыйныя войскі паспешна грузіліся ў эшалоны. Але ў гэты час украінскія буржуазныя нацыяналісты, прадаўшыя Украіну немцам, рыхтавалі новае здраднійства, вялі тайныя перагаворы з англа-французскімі інтэрвентамі, а іх галоўны атаман пагромшчык Петлюра ліхаманкава фармаваў контррэвалюцыйныя банды.

У гэтыя дні таварыш Сталін у артыкуле «Украіна вызваляецца» пісаў: «Але барацьба яшчэ не скончана, перамога яшчэ не забяспечана. Сапраўдная барацьба на Украіне толькі распачалася». Папярэджваючы, што на змену германскіх захватчыкаў ворагі народа падрыхтоўваюць прыход новых прыгнятальнікаў, таварыш Сталін заклікаў, масы на барацьбу з душыцелямі Украіны.

У другой палове лістапада пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна быў створан Украінскі Рэвваенсовет, і Чырвоная Армія рушылася на дапамогу украінскім паўстанцам. Шчорс быў прызначан камандзірам брыгады 1-й украінскай совецкай дывізіі, наступаўшай на Кіеў. У брыгаду Шчорса, апрача Багунскага палка, увайшоў Тарашчанскі полк пад камандай Бажэнка, сфармаваны з паўстанцкіх атрадаў Тарашчанскага павета Кіеўшчыны. Камандуючы брыгадай, Шчорс у той-жа час аставаўся камандзірам Багунскага палка.

Наступленне Багунскага палка было выключным па сваёй імклівасці. Шчорс майстэрска ўжываў выпрацаваную ім у партызанскіх баях тактыку: біць ворага ва фланг і тыл, біць нечакана, не даючы яму магчымасці апомніцца і раззбраціцца ў абстаноўцы. У баях ля м. Седнева, ля Чарнігава, ля сёл Сяміполкі і Бровары Багунскі полк на чале са Шчорсам разграміў найбольш боездольныя часці петлюраўцаў, перагарадзіўшых шлях да Кіева.

5 лютага 1919 года брыгада Шчорса ўступіла ў Кіеў. Сталіца Украіны была вызвалена, але барацьба за совецкую ўладу на Украіне прадстаяла яшчэ жорсткая. У канцы сакавіка, атрымаўшы падмацаванне, Петлюра перайшоў у контрнаступленне. У гэты час Шчорс ужо камандаваў першай украінскай совецкай дывізіяй (зараз 44-й), сканцэнтраванай у раёне Вінніцы. Петлюра прабаваў выйсці ёй у тыл і нанесці ўдар на Кіеў праз Бердзічаў і Кораснень. Шчорс распрацаваў свой контрманеўр і выканаў яго маланкава. На працягу двух дзён ён перакінуў Багунскі полк па чыгунцы з раёна Вінніцы на подступы да Кіева з боку Кораснеця, і ірваўшыяся да горала петлюраўцы былі адкінуты далёка назад. На бердзічаўскі участак Шчорс перакінуў Тарашчанскі полк. Тут разгараўся бой, які прадаўжаўся 9 дзён—з раніцы да ночы. Шчорс увесь час знаходзіўся ў перадавой лініі пад ураганным агнём.

Момантамі становішча было катастрафічным. Петлюраўцы, меўшыя велізарную колькасную перавагу, вось-вось маглі прарваць фронт. Але як толькі ствараласа дзе-небудзь пагроза, з'яўляўся Шчорс вярхом на кані, прыводзіў адступаючыя пэпі ў парадак і вёў іх у контратаку. На пяваты дзень бою петлюраўцы выдахліся і пачалі ў беспарадку адступаць да галіцыйскай граніцы.

Летам 1919 года дывізія Шчорса, якая падышла да граніцы Галіцыі, была крайнім заходнім аванпостам Чырвонай Арміі. Вораг рваўся на Украіну, але гераічныя контратакі шчорсаўцаў гналі яго назад.

Шчорс заўсёды быў на самых небяспечных участках фронта, натхняючы байцоў прыкладам свайго бясстрашша.

30 жніўня 1919 года Шчорс загінуў, зражоны куляй ворага. Але тысячы байцоў, якіх ён вучыў бясстрашна змагацца за социялістычную радзіму, за шчасце народа, і зараз з гонарам называюць сябе шчорсаўцамі.

Е. ГЕРАСІМАЎ,
М. ЭРЛІХ.
(«КР. ЗВЕЗДА»).

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

На гвадалахарскім участку кавалерыйскія часці рэспубліканцаў з поспехам зрабілі разведчыя аперацыі, вярнуўшыся без страт у сваё размяшчэнне. Паводле паведамлення агенцтва Гавас, на поўначы правінцыі Гвадалахара рэспубліканская артылерыя, карыстаючыся ўказаннямі разведчых самалётаў, пралаўжала граміць умацаванні і тылавыя размяшчэнні мяцежнікаў, нанёсшы ім буйныя страты і разбурэнні.

У часе раптоўнай атакі на адным з участкаў цэнтральнага фронта рэспубліканцы захапілі загад фашысцкага камандавання, які прапануе паліцыі арыштоўваць у кожнага дэзертыра членаў яго сям'і — бацьку, маці, братоў ці сёстраў.

УСХОДНІ ФРОНТ

У рэзультаце абстрэлу рэспубліканскай артылерыяй тылу мяцежнікаў, у Альмудэбары (на паўднёвы усход ад Уэскі) узарваўся вялікі склад боепрыпасаў.

ІТАЛЬЯНСКІЯ ПІРАТЫ СВАВОЛЬНІЧАЮЦЬ НА МІЖЗЕМНЫМ МОРЫ

ЛОНДАН, 1 лютага. (БЕЛТА). У сувязі з патапленнем англійскага ганлёвага судна «Эндыміён» іспанскае пасольства апублікавала заяву, у якой гаворыцца:

«Іспанскі рэспубліканскі ўрад катэгарычна адмаўляе, што ў распаражэнні мяцежнікаў ёсць якія-небудзь свае падводныя лодкі. Усяму свету павінна быць ясна, што падводныя лодкі, якія робяць піратскія акты ў басейне Міжземнага мора, належаць Італіі. Іспанскі рэспубліканскі ўрад вымушан выказаць здзіўленне з повану таго, што ўмяшанне ў іспанскія справы дапускаецца ў такіх размерах, калі мяцежнікам прадастаўляецца магчымасць уключаць у свой флот буйныя адзінкі ваенна-марскога флота іншай дзяржавы».

* * *

ЛОНДАН, 1 лютага. (БЕЛТА). Іспанскі пасол уручыў міністэрству замежных спраў Англіі ноту, у якой гаворыцца, што італьянскі ўрад, наперакор сваім міжнародным абавязацельствам, прадаставіў у распараджэнне іспанскіх мяцежнікаў два эскадраныя мінаносцы, якія плаваюць цяпер пад іспанскім манархічным сцягам. Гэтыя эсмінцы выкарыстоўваюцца мяцежнікамі ў якасці мінных загараджальнікаў. Апрача таго мяцежнікі атрымалі ад італьянцаў яшчэ 2 мінаносцы, пабудаваныя ў 1914 годзе.

* * *

ЛОНДАН, 1 лютага. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, 4 англійскія эсмінцы праводзяць у раёне Картахены (порт на паўднёвым усходзе Іспаніі) пошукі падводнай лодкі, патапіўшай англійскае ганлёвае судно «Эндыміён».

ПАВЕДАМЛЕННЕ АГЕНЦТВА РЭЙТЭР

ЛОНДАН, 2 лютага. (БЕЛТА). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што англійскі ўрад надае сур'ёзнае значэнне патапленню іспанскімі мяцежнікамі англійскага ганлёвага судна «Эндыміён». Урад зараз разглядае пытанне аб тым, якія меры прадпрымаць ў сувязі са стварыўшымся становішчам. Англійскі ўрад,—гаворыць агенцтва,—ніколі не прызнаваў за Франко права на блакаду іспанскага ўзбярэжжа, бо ніхто не прадастаўляў яму права взюючага боку.

МІТЫНГ ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ ЗВЕРСТВАЎ ФАШЫСЦКАЙ АВІЯЦЫІ

ПАРЫЖ, 2 лютага. (БЕЛТА). 4 лютага французскай кампартыяй арганізуюцца ў Парыжы і прадмесцях восем вялікіх мітынгаў пратэсту супроць варварскіх бамбардыровак фашысцкімі інтэрвентамі гаралоў рэспубліканскай Іспаніі. На мітынгах выступяць члены ЦК кампартыі і 22 комуністычныя дэпутаты.

Марсель Кашэн выступіў на старонках «Юманіта» з новым заклікам да салідарнасці з рэспубліканскай Іспаніяй.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

ХАНЬКОЎ, 1 лютага. (БЕЛТА). На паўднёвым участку чыгункі Цяньцзінь—Пукоу неаднаразовыя спробы японскіх войск на працягу апошняга тыдня перайсці раку Цыхэ (каля Мінгуана) не мелі поспеху.

Пасля поўнага разбурэння артылерыйскім агнём і паветранымі бамбардыроўкамі кітайскіх пазіцый кітайскія войскі адышлі ад рэчкі Сяоцыхэ. Ля Ліньхуайгуаня кітайскія часці пабудавалі буйныя абаронныя ўмацаванні.

На цэнтральным фронце японцы прадпрынялі новую аперацыю для захвату шашы Хуайань—Нанкін, якая ідзе ўздоўж Вялікага канала. Мэта гэтай японскай аперацыі — адрэзаць кітайскія часці, якія знаходзяцца на ўсход ад памянёнай шашы. Японцы перакінулі ў рэён шашы буйныя злучэнні. Кітайскія часці, каб затрымаць прасоўванне ворага, разбурылі паўднёвы ўчастак шашы і затапілі пасёлак Уцзячжэнь.

ЯПОНІЯ РЫХТУЕЦЦА ДА ДОЎГАЙ ВАЙНЫ

ТОКІО, 2 лютага. (БЕЛТА). Газета «Міяко» паведамляе, што японскі ўрад на працягу бягучага тыдня ўнясе на зацвярджэнне парламента новы законапраект аб «усеагульнай мабілізацыі краіны». Газета лічыць, што законапраект сустрэне ў парламенце процідзеянне. Урад, піша газета, ужо цяпер вядзе падрыхтоўчую работу, дабіваючыся прыняцця парламентам гэтага закона.

У СОВЕЦЕ ЛІГІ НАЦЫЙ

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПА КІТАЙСКАМУ ПЫТАННЮ

ЖЭНЕВА, 1 лютага. (БЕЛТА). Рэзалюцыя па кітайскаму пытанню, выпрацаваная на нарадзе прадстаўнікоў чатырох дзяржаў (Англіі, Францыі, СССР і Кітая) учора вечарам, прадстаўлена для абмеркавання на закрытым пасяджэнні Совета Лігі нацый.

У рэзалюцыі з жалем адзначаецца працяжэнне і ўзмацненне ваенных дзеянняў у Кітаі.

Рэзалюцыя напамінае і цытуе пастанову пленума Лігі нацый, прынятую 6 кастрычніка 1937 года, у якой усім членам Лігі нацый рэкамендуецца ўстрымацца ад дзеянняў, якія могуць аслабіць сілу супраціўлення Кітая, а таксама абдумаць, «наколькі дзяржавы — члены Лігі нацый — могуць індывідуальна аказаць дапамогу Кітаю».

Рэзалюцыя звяртае самую сур'ёзную ўвагу членаў Лігі нацый на гэтыя рашэнні пленума. Нарэшце, рэзалюцыя «давярае тым членам Лігі, якія спецыяльна зацікаўлены ў справах Далёкага Ўсхода», не ўпускаць ніякай магчымасці прымяніць, у кантакце з другімі дзяржавамі, у роўнай меры зацікаўленымі ў далёкаўсходніх справах, і іншыя падыходзячыя спосабы справядлівага ўрэгулявання канфлікта.

Да ваенных дзеянняў у Кітаі. **НА ЗДЫМКУ:** байцы кітайскай арміі ля зенітнай гарматы. (СФ).

МАЛОДШЫ КАМАНДЗІР КАРОТЫЧ

Малодшы камандзір тав. Каротыч П. К.— новы чалавек у батарэі. Ён нядаўна быў выпушчан з палкавой школы. Перш за ўсё малады камандзір пачаў знаёміцца з байцамі новага папаўнення. Ён узяўся за стараннае вывучэнне даверанага яму для выхавання байцоў, гутарыў з кожным з іх, знаёміўся з байцамі ў хозве вучобы.

Да заняткаў тав. Каротыч рыхтуецца ўдумліва, старанна. Напярэдадні ўрока ён раіцца з камандзірам батарэі, старшым лейтэнантам тав. Рындзіным, потым уважліва чытае настаўленні. Складае кароткі прадуманы канспект з указаннем мэтавай устаноўкі ўрока, зместу і часу яго правядзення, матэрыяльнага забеспячэння. Толькі падрыхтаваўшы ўсё неабходнае для наступных заняткаў, тав. Каротыч ідзе адпачываць.

Раніцою ён устае першым, строіць байцоў, вядзе на зарадку. Балёрым жартам падымае малады камандзір дух байцоў, энергічна робіць вольныя рухі. І глядзячы на яго, байцы ахвотна займаюцца фізкультурай.

Пасля снедання пачынаюцца заняткі. У клас арганізавана ўваходзяць байцы і хутка рассаджваюцца закол стала. На стале перад камандзірам—вінтоўка. Многія ўжо вывучылі яе, некаторыя страялі да прыходу ў армію. Гэтыя таварышы на асобным учоце ў тав. Каротыча. Праводзячы заняткі, ён апіраецца на гэты стралковы актыў.

Не спяшаючыся, разбірае камандзір вінтоўку, называючы кожную дэталь, пасяняючы яе прызначэнне і паказваючы ўзаемадзеянне частак зброі. Вінтоўка зноў сабрана. Усё, што прарабіў камандзір, учаўнена паўтараюць байцы.

Байцу Ларыонаву цяжка давалася вывучэнне матэрыяльнай часткі. Слаба разбіраючыся ў састаўных частках зброі, ён механічна запісваў назву частак вінтоўкі.

— Не пішыце. Наглядайце. Тады лепш зразумееце, — сказаў яму камандзір. Ён прымапаваў да тав. Ларыонава Губачова, даўшы яму наказ: пазаяліцеся сваімі ведамі, дапамажыце адстаючым.

Таварыская дапамога камандзіра і прымацаванага байца хутка даюць рэзультаты. Тав. Ларыонаў вывучыў вінтоўку, палюбіў яе. Часта ў пазашкольны час ён разбірае затвор.

Вельмі любяць байцы, калі заняткі па фізпадрыхтоўцы праводзіць тав. Каротыч. Ён добра працуе на турніку і свой вопыт перадае новаму папаўненню. За кароткі час байцы дабіліся пад яго кіраўніцтвам вялікіх поспехаў.

Заўсёды балёры, чоткі, акуратны ў выкананні загадаў, уважлівы да людзей, добра ведаючы сваю справу, горача адданы радзіме, тав. Каротыч з'яўляецца ўзорам для падначаленых. Асабістым прыкладам дабіваецца ён выдатнай работы свайго ўзвода. Сур'ёзна працуе ён над сабою, вывучае «Пытанні ленінізма», глыбока вывучыў Сталінскую Канстытуцыю і прапагандуе сярод байцоў гэты гістарычны дакумент.

На аснове соцыялістычнага спаборніцтва байцы ўзвода дабіваюцца высокіх паказальнікаў у рабоце і вучобе.

А. К.

СПЕКТАКЛІ, РАНІШНІКІ, ТВОРЧЫЯ СПРАВАЗДАЧЫ

Калектыў работнікаў Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра ўзяў на сябе рад практычных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да слаўнай галавіны.

Пачынаючы з 15 лютага, кожны вечар артысты будуць выступаць перад пачаткам спектакляў з чытаннем вершаў, прысвечаных Чырвонай Арміі. Створана канцэртная брыгада са спецыяльнай праграмай для выезду ў чырвонаармейскія часці. Скора ў тэатры будзе арганізавана выстаўка, якая аллюструе баявы шлях Чырвонай Арміі. Некалькі вядучых работнікаў тэатра будуць вылучаны для правядзення двухтыднёвых семінараў з кіраўнікамі самадзейных гурткоў у Чырвонай Арміі, а адзін акцёр — для практычнай дапамогі мастацкай самадзейнасці палкавой тэатру часці.

Калектыў абавязаўся таксама даць не менш двух ранішніх спектакляў для байцоў Чырвонай Арміі ў будынку тэатра і адзін ў палкавой часці.

Будуць арганізаваны вечары сустрэчы з байцамі Чырвонай Арміі і творчыя справаздачы вядучых акцёраў у чырвонаармейскіх часцях.

ДА КАНЦА ЛІКВІДАВАЦЬ ІНФЕКЦЫЙНУЮ АНЕМІЮ

Бяздзейнасць і ратазейства многіх зямельных органаў у цэнтры і на месцах, а таксама кіраўнікоў калгасаў і ветработнікаў спрыяла ворагам распаўсюджэнь інфекцыйныя хваробы (алемію, сібірскую язву і інш.). Замест рашучай барацьбы — шляхам своечасовага выяўлення хворых коней, накладання на справе, а не на паперы карантынаў, правядзення прафілактычных мерапрыемстваў — абмяжоўваліся фармальным фіксаваннем фактаў. Ветурачы вырашалі пытанне барацьбы з інфекцыйнымі хваробамі нерашуча, стараючыся сваю адказнасць перакласці на свае кіруючыя органы, а кіруючыя органы не давалі своечасова ясных і чоткіх указанняў візавой ветэрынарнай сетцы.

Парушэнне карантыннага рэжыму шырока мела месца ў калгасах БССР. Так, напрыклад, старшыня калгаса «Чырвоны барацьбіт» (Камарынскі раён) т. Белінчанка раз'язджаў на конях карантыннага калгаса па калгасах «III Інтэрнацыянал», «Дняпроўскі араты», «Рухавік рэволюцыі», у рэзультаце чаго ў гэтых калгасах з'явілася захворванне інфекцыйнай анеміяй.

У калгасе «Авангард», Уваравіцкага раёна, быў наклазен карантын і вылучана 12 заражаных коней. Але старшыня райвыканкома Прымакоў даў распараджэнне знядь карантын і заражаных коней аб'яднаць са здаровымі. Таксама былі зняты карантыны і ў калгасах «Зугагр» і «Другая пяцігодка».

Рашучай барацьбы з інфекцыйнай анеміяй да апошняга часу ў рэспубліцы не вялося. Мерапрыемствы, якія праводзіліся ў чэрвені і жніўні мінулага года па Слупкай акрузе, з'яўляліся няправільнымі, аднабаковымі, а часам і шкодніцкімі.

Соўнарком Саюза выдаў спецыяльную пастанову па барацьбе з інфекцыйнай анеміяй, накіраваную на канчатковую ліквідацыю гэтай небяспечнай эпізоотыі. Устаноўленыя данай пастановай мерапрыемствы ў аснове сваёй заключаюць наступнае: коні, яўна хворыя інфекцыйнай анеміяй, непрыгодныя да эксплаатацыі, забіваюцца. Коней перахваравўшых, выхронікаў, здольных да работы, трэба вывезці ў спецыяльныя анемагаспадаркі за межы рэспублікі. Апрача таго, трэба прамежы рэспублікі. Апрача таго, трэба правесці рад ветэрынарных мерапрыемстваў. Усё гэта дае магчымасць канчаткова аздаравіць заражоныя гаспадаркі.

Задача зямельных і ветэрынарных работнікаў, калгаснікаў, партыйных і совецкіх арганізацый гэтыя мерапрыемствы правесці выключна чотка, каб не асталося ні аднаго хворага каня ў гаспадарцы. У развіцё пастановы Саюзнага Соўнаркома, СНК БССР у сваім рашэнні ўстанавіў у раёнах камісіі па правядзенню ўказаных мерапрыемстваў. Камісіі павінны ў кожнай гаспадарцы, паражонай анеміяй, правесці чоткую праверку ўсіх дакументаў, прагляд усяго конскага паголоўя. Камісіі павінны помніць, што ў іх задачу ўваходзіць не толькі вывазка хворых коней, у іх задачу ўваходзіць старанная паслядоўная апрацоўка кожнай гаспадаркі, правядзенне своечасовай дэзінфекцыі, прагляд збруі, ачыстка канюшні, прывядзенне ў парадак жывёла-магільнікаў і сістэматычная трохмесячная тэрмаметрыя ўсяго конскага паголоўя ў сумежных калгасах з паражонымі.

Саюзны ўрад адпускае каласальныя сродкі на правядзенне данага мерапрыемства, адпускае лоўгатэрміновы крэдыт на 4 гады ў суме 2.040.000 рублёў і безвяротную ссуду 843.000 рублёў. Для паражоных гаспадарак будзе вагатоўлена 3.000 галоў валоў узамен выбываючых коней. Завозяцца 500 пяжкіх трактараў, 300 грузавых аўтамашын і 150 прыцэпаў да іх. Адпускаючы такія каласальныя сродкі, урад патрабаваў выключнай адказнасці кіраўнікоў раёнаў, сельсоветаў, калгасаў, ветработнікаў і саміх калгаснікаў за своечасовае і дакладнае правядзенне даных мерапрыемстваў у жыццё, за выключную чыстату апрацоўкі гаспадарак па аздараўленню.

Трэба канчаткова выкарчаваць вынікі шкодніцтва ў галіне конегадоўлі, да канца ліквідаваць злаякасную хваробу — інфекцыйную анемію коней.

В. МІРОНАЎ.

Тт. АСЕВЕДО І ДЖЭРМАНЕТО Ў РАБОЧЫХ ЗАВОДА імя ВАРАШЫЛАВА

Прыбыўшыя ў Менск старшыня іспанскай секцыі МОПР'а тав. Асеведо і член Выканкома МОПР'а, член ЦК кампартыі Італіі тав. Джэрманета наведалі ўчора завод імя Варашылава.

Варашылаўцы наладзілі гасцям урачыстую сустрэчу.

На мітынгу рабочых выступіў тав. Асеведо, які перадаў сабраўшымся палкае прывітанне ад гераічнага іспанскага народа, які змагаецца супроць банд Франко і італа-германскіх інтэрвентаў за сваю свабоду і незалежнасць.

Бурнымі апладысментамі было сустрэта выступленне тав. Джэрманета.

Ад імя калектыва завода слова ўзяў стары рабочы тав. Лоскат, які заклікаў рабочых пашырыць рады МОПР'аўскай арганізацыі і яшчэ лепш дапамагаць барацьбітам супроць фашызма.

Апладысментамі і воклічамі «ура» ўдзельнікі мітынга віталі гераічны іспанскі народ і працоўных Італіі.

МОТАПРАБЕГ УЗДОЎЖ ГРАНІЦ БССР

У гонар 20-й галавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота менскі аўта-мотаклуб арганізуе мотапрабег з лыжніцамі на буксіры ўздоўж граніц БССР аллегласцю ў 600—700 кілометраў. У прабегу прымуць удзел 10 вадзіцеляў матацыклаў і 10 лепшых лыжніц добраахвотных спартыўных таварыстваў і прадпрыемстваў сталіцы.

У дарозе на астаноўках лыжніцы і вадзіцелі будуць праводзіць сярод насельніцтва гутаркі аб слаўным юбілеі Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота і аб рашэннях студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б).

Старт мотапрабегу — 23 лютага.

ХРОНІКА

СНК СССР зацвердзіў тав. **Хазан Д. М.** намеснікам Народнага Камісара Лёгкай Прамысловасці СССР.

СНК СССР зацвердзіў т. **Беспалава Н. Н.** намеснікам старшыні Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР.

Намеснік адказнага рэдактара І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Гукавы кінотэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“

Заўтра, 4 лютага,
новы вялікі мастацкі гукавы фільм
ВАЛАЧАЕЎСКІЯ ДНІ

Беларускі Дзяржаўны Драматычны тэатр
3 лютага Абан. № 109
«БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫЯ»

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка»
1) ПРАМОВА таварыша МОЛАТАВА аб выбарчым блоку комуністаў і беспартыйных.
2) «БЯЛЕЕ ПАРУС АДЗІНОКІ»

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»
ЗАПАРОЖАЦ ЗА ДУНАЕМ

Дзіцячы гукавы кінотэатр
АРСЕН

Кінотэатр «Навасці дня» (памяшк. дзіцячага кінотэатра)
1) Масква выбірае. 2) Калгасная восень. 3) «Звездочка».

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»
ПОЎНАЛЕЦЦЕ

Гукавы кінотэатр «Спартак»
КЛЯТВА

Адміністрацыя і мясцком работнікаў суда, пракуратуры і калектыва абаронцаў гор. Менска з жалем паведамляюць аб раптоўнай смерці старайшага члена калегіі абаронцаў Аляксандра Аляксандравіча ЮГАНСЕНА, паследаўшай 1 лютага 1938 г. у 6 гадзін вечара і выказваюць глыбокае спачуванне сям'і нямёршага.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛЕФОНУ 21-845

УВАГА! УВАГА!
У магазіне „СТАНКАІНСТРУМЕНТ“
Белмесцпромснабзбыту
(Менск, плошча Волі, д. 1/25. Тэл. 22-304)
ЁСЦЬ у ПРОДАЖЫ:
СТАНКІ па МЕТАЛУ:
ФРЭЗЕРНЫЯ, ТАКАРНЫЯ, СВІДРАВАЛЬНЫЯ, БОЛТАНАРЭЗНЫЯ, ГОНТАРЭЗНЫЯ;
«ВАРЦІНГТОНЫ», ГАРШКІ КАНДЭНСАЦЫЙНЫЯ, ВЕНТЫЛЯТАРЫ «СІРОКА» № 4 і іншае.
Розны СЛЯСАРНА-МАНТАЖНЫ і СТАЛЯРНЫ ІНСТРУМЕНТ—ЦІСКІ розныя, ГАЕЧНЫЯ КЛЮЧЫ, СТАМЕСКІ, ДОЛАТЫ, БУРАВЫ і інш.
ВЯЛІКІ ВЫБАР
НАЖДАЧНА-ТАЧЫЛЬНЫХ КРУГОЎ і БРУСКОЎ.

ВЫМЯРАЛЬНЫЯ ПРЫБОРЫ: МІНІМЕТРЫ, ІНДЫКАТАРНЫЯ ГАЛОЎКІ, ПЛІТЫ ПАВЕРАЧНЫЯ, ЛІНЕЙКІ МАШТАВНЫЯ, МІКРОМЕТРЫ, ШТАНГЕНРЭЙСМУСЫ, ГЛЫБІНАМЕРЫ і інш.
ВАГІ СОЦЕННЫЯ, НАСТОЛЬНЫЯ 5—20-КІЛОГР. і ВЯЗМЕННЫЯ.
УНІВЕРСАЛЬНЫЯ ПАДЗЯЛЯЛЬНЫЯ ГАЛОЎКІ, РАЗЦЫ, ФРЭЗЫ ЧАРВЯЧНЫЯ, ПАТРОНЫ СВІДРАВАЛЬНЫЯ, ШАРЫКАВЫЯ ПАДШЫПНІКІ РАДЫЯЛЬНЫЯ і іншае.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Праэідыум і групком Акадэміі навук БССР і калектыў супрацоўнікаў інстытута эксперыментальнай фізіялогіі выказваюць спачуванне дырэктару інстытута прафесару ВЕТОХІНУ І. А. з прычыны нясцішчага яго горасмерці ЖОНКІ.

Калектыў навуковых работнікаў і студэнты біялагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта выказваюць глыбокае спачуванне прафесару І. А. ВЕТОХІНУ з прычыны нясцішчага яго гора — смерці ЖОНКІ.

Пользуйтесь новым видом связи —
ФОТОТЕЛЕГРАФОМ
Ф4 Фото-телеграмма. Адрес: Смоленск, Запрудная, ул. Пушкина д. 13. Из Минска. Подана 12/I 13 ч. 30 м. № 1250. Посылаю чертеж станка. Петров.
Ф4 Фото-телеграмма. Адрес: Москва 66 ул. Маркса д. 20, кв. 31 А. С. Кузьминову. Из Минска. Подана 12/I 12 ч. 45 м. № 1300. Посылаю свою фотокарточку. Через месяц приеду. Целую, маму, тебя. Привет родным. Клара.

МЕНСКІ ЦЭНТРАЛЬНЫ ТЭЛЕГРАФ
мае фотатэлеграфную сувязь з гарадамі МАСКВОЙ і СМАЛЕНСКАМ.
ФОТАТЭЛЕГРАФНЫЯ ПЕРАВОДЫ, ПЕРАДАЧЫ РУКАПІСАЎ, ЗДЫМКАЎ, МАЛЮНКАЎ, КАРТ, ДЫЯГРАМ, СХЕМ, ДАКУМЕНТАЎ У АРЫГІНАЛЕ, СКЛАДАНЫХ ТАБЛІЦ, ВЫРАЗАК і т. д.
МОГУЦЬ БЫЦЬ ЗРОБЛЕНЫ ПА ФОТАТЭЛЕГРАФУ ХУТКА, ЧОТКА
з дакладным адбіткам паданай фотатэлеграмы.
Прыём фотатэлеграм і выдача фотабланкаў праводзіцца ў касе Цэнтральнага тэлеграфа (Ленінская, 34, другі паверх) і на тэлеграфе пры Доме ўрада.

Фотатэлеграмы прымаюцца на спецыяльных фотабланках устаноўленых памераў, пры чым колеры чарніл, тушы, фарбаў, фатаграфій і інш. павінны быць толькі чорнымі.
Падрабязныя весткі аб умовах карыстання фотатэлеграфам можна атрымаць непасрэдна ў касе цэнтральнага тэлеграфа.
ФОТАТЭЛЕГРАМЫ аплачваюцца па памеры фотабланка, незалежна ад колькасці напісаных слоў, па наступнаму тарыфу:

Размер фотабланкаў	У Маскву і Смаленск
218×50 мм	3 р. 50 к.
218×75 мм	5 р.
218×150 мм	10 р.
218×225 мм	15 р.
218×300 мм	20 р.

МЕНСКАМУ НЕДЫНСТЫТУТУ *патрэбны* на пастаянную работу РАБОТНІКІ ВЕНАЛКІ І ПРЫБІРАЛЬНІЧЫЦЫ.
Звяртацца па адрасу: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой № 2-33.

ТРЭСТУ ЛЕСБЕЛ *патрэбны* ШОФЕРЫ для работы па лесавозах ў механізаваных пунктах і аўтабазах (на тэрыторыі БССР) на аўтамашынах ЗІС-5 і ЗІС-13.
Звяртацца: гор. Менск, Дом Наркомлеса (Комсамольская вул.) трэст Лесбел, аддзел механізацыі.

4 ЛЮТАГА, У 7 ГАДЗІН ВЕЧАРА, У ПАМЯШКАННІ ДОМА ПАРТАКТЫВА (рог вул. Карла Маркса і Энгельса)
адбудзецца
ПАСЯДЖЭННЕ ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Паведамленне аб рабоце першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР (дакл. тав. Ванеєў).
2. Вынікі работы школ гор. Менска за першую палову і задачы школ на другую палову навучальнага года (дакл. тт. Іванішчанка, Жыткова (старшыня секцыі Нарасветы).
3. Арганізацыйныя пытанні.
Яўка членаў і кандыдатаў гор совета абавязкова.
ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

4 ЛЮТАГА, У 7 ГАДЗІН ВЕЧАРА, У ГОРСОВЕЦЕ (2-гі паверх, пакой № 32)
СКЛІКАЕЦЦА
НАРАДА СТАРШЫНЬ КАМСОДАЎ,
ЗБОРШЧЫКАЎ ПА КАЛЕКТЫЎНАМУ СТРАХАВАННЮ ЖЫЦЦЯ І БУХГАЛТАРОЎ Сталінскага раёна гор. Менска.
Яўка старшынь камсодаў, зборшчыкаў па калектыўнаму страхаванню жыцця і бухгалтароў абавязкова.
Таксама па нараду запрашаюцца старшыні фабзаўмясцкомаў.
МЕНГАРКАМСОД.
ЦЭНТРАЛЬНАЯ АШЧАДКАСА № 16.

Аддзел МЕР і ВАГАЎ НКВД БССР
прадпадае ўсім прадпрыемствам, якія выробляюць і рамонтуюць вымяральныя прыборы, ЗАРЭГІСТРАВАЦЦА ў ОМВ НКВД БССР / Менск, Правадная, 6 / ДА 15 ЛЮТАГА 1938 г.
Прадпрыемствы і майстэрні абавязаны прадставіць наступныя звесткі. 1) назва прадпрыемства; 2) у якое аб'яднанне (наркамат) яно ўваходзіць; 3) адрас прадпрыемства; 4) наменклатура: а) выпускаемых з выт'ворчасці і б) выпускаемых з рамонту вымяральных прыбораў; 5) як арганізаван тэхнічны кантроль.
Рэгістрацыя праводзіцца бясплатна. Носіць явачны характар. Арганізацыі і асобы могуць паведамляць указаныя звесткі пісьмова — па пошце.
У выпадку ўхілення прадпрыемства і асоб ад выканання данага ўказання, вінаўныя працягваюцца да адказнасці.
ОМВ НКВД БССР

УКРАДЗЕНА квітанцыя № 80682, выданая Менскім водачным заводам на атрыманую пасуду ад Менпрамгандлю праз тав. Панасенкова Е. Л. на суму 787 р. 68 к. Лічыць несапраўдным.

ЗГУБЛЕНА круглая пячатка і дакумент на здачу заказа на пячатку на імя калгаса «Власть Советов», Брагінск. р-ёна, Крычэўск. с.-с. Лічыць несапраўдным.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая 63. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352, сакратарыята — 25-188, 20-830; аддзелаў: партыйнага — 21-353, совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412, прамысловага — 21-356, сельскагаспадарчага — 21-846, культуры — 23-955, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189, аддзела пісем — 20-844, 21-399, 21-855, ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры—21-556, аб'яў — 21-845.

Уп. Галоўлітбела № К—5429. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. К. Л. Б. 1.